№ 33 (535) 6 верасьня 2007 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Аднoўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у чацьвяргі

# Энэргетычны флірт

Беларусь заявіла пра жаданьне далучыцца да эўрапейскай энэргасыстэмы. Намесьнік міністра замежных справаў Валер Варанецкі ў Брусэлі запрасіў эўрапейскіх інвэстараў у стратэгічныя сфэры беларускай эканомікі. Старонка 8.



Анахранічная стылістыка помніка Прохарава аднак спадабалася правінцыйнаму чынавенству. Першы конны — піша Сяргей Харэўскі. **Старонка 16.**

## Усяслаў

паміж Кастрычніцкай і Эўфрасіньнеўскай



СЯМЁН ПЕЧАНКО

## Працэсы ідуць

**Чарговыя суды над беларускамоўнымі актывістамі ў цэнтры ўвагі правінцыйных габардоў. На фота: Наста Азарка з Паўлам Севярынцам пасьля суду ў Нясьвіжы. Старонка 6.**

## У НУМАРЫ

### Ганс вялікі і Ганс малы

Гаворка не ідзе пра здраду клясычнаму правапісу як прынцыпу. Новыя правілы дадуць нам падставу гаварыць пра адну беларускую мову на постсавецкім этапе яе разьвіцьця. Піша Сяргей Дубавец. **Старонка 4.**

### «Падарунак» да 1 верасьня

У новавыдадзеных праграмах па літаратуры няма вызначальных твораў Купалы, Быкава, Шамякіна. Затое ёсьць Чаргінец і Аўруцін. Піша Лявон Баршчэўскі. **Старонка 3.**



# 8 верасьня

— Дзень беларускай вайсковай славы. У гэты дзень у 1514 годзе літвіны і русіны разьбілі расейскае войска ў бітве на рацэ Крапівенцы, што ля Воршы. Гэтая выдатная перамога надоўга спыніла расейскую экспансію. Гістарычная перадышка падоўжыла Залаты Век Вялікага Княства Літоўскага, калі расквітнелі ў ім культура і мастацтвы. Традыцыйна ў гэты дзень барды і моладзь зьяжджаюцца на Крапівенскае поле. У 1990–я гады ў сталіцы ў гэты дзень адбываліся шматлюдныя шэсьці і канцэрты.



## АПЫТАНЬНЕ З САЙТУ NN.BY

**Якая з гэтых краінаў падаецца Вам найбольш натуральнай саюзьніцай Беларусі?**

| | |
|---|---|
| Расея | 104 (11.0%) |
| ЗША | 110 (11.6%) |
| Германія | 40 (4.2%) |
| Украіна | 282 (29.8%) |
| Літва, Латвія | 161 (17.0%) |
| Польшча | 218 (23.0%) |
| Кітай | 32 (3.4%) |

Усяго прагаласавала 947

# Героі вяртаюцца ў гісторыю

Гутарка з **Уладзімерам Арловым** пра ключавыя праблемы беларускай гісторыі.

**— Згодна з распаўсюджаным уяўленьнем, беларусы — гэта народ, які ня ведае ўласнага мінулага, і таму палітыкам лёгка ім маніпуляваць, апэлюючы да гістарычных мітаў...**

—Існуе дзьве Беларусі, і кожная зь іх у розных дачыненьнях з гісторыяй. Адна Беларусь пачуваецца спадкаемніцай Савецкага Саюзу.

**Працяг на старонцы 18.**



PHOTO.BYMEDIA.NET

**БРСМ БУЙНЕЕ. БРСМ дэкляруе, што ў яго ўступілі ўжо 430 тысячаў чалавек. Першы сакратар ЦК БРСМ Леанід Кавалёў у часе прэс-канфэрэнцыі да 5-годзьдзя ўтварэньня арганізацыі.**

# «Прашу ахвяраваць гэты дзень Беларусі»

Зварот **Аляксандра Мілінкевіча** з нагоды Эўрапейскага Маршу.

Лідэр Руху за Свабоду зьвярнуўся з заклікам далучыцца да маніфэстацыі, прызначанай на 14 кастрычніка.

«Прашу жыхароў гарадоў і вёсак ахвяраваць гэты дзень Беларусі. Прыедзьце на Пакроў у сталіцу. Адчуйма разам дух Свабоды, — піша ён. — Дзяўчаты і хлопцы! На цябе, наша моладзь, надзея! Слухайце сваё сумленьне, рабіце дабро і нічога ня бойцеся».

Ён адказвае скептыкам, што сумняюцца ў эфэктыўнасьці масавых акцый: «Маніфэстацыі — самы эфэктыўны спосаб барацьбы за свабоду. Седзячы ў хаце — нічога не даб'емся. Трэба выходзіць! Столькі, колькі спатрэбіцца, каб вызваліць саміх сябе. Няма іншай рады. Так рабілі іншыя народы Эўропы».

Мілінкевіч акцэнтуе неабходнасьць спалучаць эўрапейскія слоганы з нацыянальнымі: «Няхай побач са сьцягамі ЭС у гэты дзень лунаюць нашы сьветлыя нацыянальныя сьцягі, гучыць нацыянальная мова».

Мілінкевіч таксама прапануе зрабіць пакроўскае шэсьце традыцыйным.

**Шаноўныя людзі!**

«Наша Ніва» шукае распаўсюднікаў для продажу газэты на вуліцах і ў электрычках. Справа выгадная і надта патрэбная.

Продаж ажыцьцяўляецца на аснове дамоваў.

Зьвяртацца праз тэл.:
(017) 284–73–29,
(029) 260–78–32,
(029) 618–54–84.

# Купала ў кожны дом

**Выйшаў першы плякат з сэрыі «Нацыянальныя героі Беларусі». Каб набыць, пытайцеся праз тэл. (029) 505-39-11 або праз e-mail: plakat@biz.by**



# «Падарунак» да 1 верасьня

У нававыдадзеных праграмах па літаратуры няма вызначальных твораў Купалы, Быкава, Шамякіна. Затое ёсьць Чаргінец і Аўруцін. Піша **Лявон Баршчэўскі**.

Пачало зьдзяйсьняцца тое, пра што гаварылася ў незалежнай прэсе на пачатку году. У нававыдадзеных праграмах па беларускай і расійскай літаратуры для сярэдніх школаў (Менск: Нацыянальны інстытут адукацыі, 2007) выразна праглядаюцца сьляды ўсёмагутнае цэнзуры й «нястомнай дзейнасьці» чаргінцоўскага Саюзу пісьменьнікаў.

Першае, што кідаецца ў вочы пра пабежным праглядзе праграмаў па беларускай літаратуры, — гэта поўная адсутнасьць якіх-кольвечы згадак пра купалаўскіх «Тутэйшых» ва ўсіх разьдзелах праграмаў. Вось жа, Купала й атрымаў падарунак на сваё 125-годзьдзе ад сучасных «тутэйшых» ды іх памагатых!

У разьдзелах пра літаратуру 1930—1950-х гадоў няма ані паўслоўца пра зьняволеньне ды фізычнае вынішчэньне бальшыні тагачасных беларускіх літаратараў — так што Леаніду Маракову няма чаго высільвацца, выдаючы чарговыя тамы з прозьвішчамі «ахвяраў і катаў»... Натуральна, што з праграмаў зьніклі і быкаўская «Аблава», і нават «Ахвяры» Івана Шамякіна.

Што ж зьявілася на месцы тых твораў, што вывучаліся раней у якасьці абавязковых? Ну, вядома ж, гэта творы ўсюдыіснай Раісы Баравіковай (вершы, п’еса «Барбара Радзівіл») і «шэдэўры» Георгія Марчука («Давыд-гарадоцкія каноны»). Вось жа, нічога новага пад Месяцам няма: вяртаньне «прыпасаднай клясыкі» ідзе поўным ходам.

Вельмі нялюбым для ананімных складальнікаў новых праграмаў зрабіўся Ўладзімер Арлоў: толькі дзьве ці тры ягоныя кнігі згадваюцца ў сьпісах літаратуры «для пазаклясснага чытаньня». Пра вывучэньне на занятках «Часу чумы» альбо «Эўфрасіньні Полацкай» гаворкі не вядзецца.

Сярод «новых імёнаў» сучаснай беларускай літаратуры згадваюцца такія «геніяльныя» літаратары, як К.Жук, Т.Трафімава, З.Падліпская (ах, я зусім забыўся: яна ж цяпер працуе ў Міністэрстве адукацыі!), М.Шабовіч альбо В. Шклярава, але прозьвішчаў Уладзімера Някляева, Вінцэся Мудрова, Барыса Пятровіча, Валянціна Акудовіча, Лявона Вольскага альбо Андрэя Хадановіча вы там не сустрэнеце. Няважна, што менавіта гэтых аўтараў сёньня выдаюць ва Ўкраіне, Польшчы, Швэцыі, Чэхіі, Нямеччыне. Галоўнае ж — не пакрыўдзіць «сваіх» і, у першую чаргу, самых сябе.

У сваю чаргу, у праграмах па расійскай літаратуры (XI—XII класы) зьмешчаныя цэлыя разьдзелы пад сумнеўнай з навуковага гледзішча назвай: «Русская литература Беларуси». Там ідзе згадка пра такіх «геніяў пяра», як М.Чаргінец, А.Скарынкін, А.Аўруцін, В.Паліканіна, С.Трахімёнак, але, вядома, «забытыя» Сьвятлана Алексіевіч, Радзіслаў Лапушын ці Андрэй Курэйчык.




PHOTO.BYMEDIA.NET

**Менская моладзь пратэстуе супраць выкіданьня клясыкі з падручнікаў.**

Пры чытаньні праграмаў кідаецца ў вочы немалая колькасьць недакладнасьцяў, спасылак на няісныя альбо маральна састарэлыя выданьні.

Вядома, аўтар гэтых радкоў і не спадзяваўся, што ў праграмах могуць быць згаданыя напісаныя ім адмыслова для старшаклясьнікаў і настаўнікаў кнігі «Літаратура ад старажытнасьці да пачатку эпохі рамантызму» і (у суаўтарстве з П.Васючэнкам і М.Тычынам) «Беларуская літаратура і сьвет». Але што сапраўды ўразіла, дык гэта тое, што ў двух месцах (с.145—146 і с.210) артыкулы Л.Баршчэўскага «Старагрэцкі эпас: Гамэр», «Старагрэцкая драма: тэатар», «Старагрэцкая проза» і «Літаратура Старажытнага Рыму», некалі апублікаваныя ў часопісе «Роднае слова», прыпісаныя аўтарству Тацяны Шамякінай.

Вядома, цешыць, што ў праграмах па беларускай літаратуры засталіся «Знак бяды» Быкава, «Чужая бацькаўшчына» Адамчыка, «Каласы пад сярпом тваім» Караткевіча, апавяданьні Міхася Стральцова, паасобныя вершы Рыгора Барадуліна, Алеся Разанава, Генадзя Бураўкіна альбо Ніла Гілевіча. Але пры гэткім імпэце сёньняшніх «рэфарматараў» ніхто ня можа гарантаваць, што і яны адтуль ня зьнікнуць і што ўжо наступнаму пакаленьню дзетак не давядзецца вывучаць беларускую літаратуру па перакладзеных на беларускую мову тварэньнях Сяргея Трахімёнка, Анатоля Аўруціна, Андрэя Скарынкіна альбо Тамары Красновай-Гусачэнкі...

Я далёкі ад таго, каб пераацэньваць у сёньняшняй Беларусі — зь сёньняшнімі настаўнікамі і зь сёньняшняй дзяржаўнай адукацыйнай палітыкай — ролі беларускай літаратуры як гуманітарнай дысцыпліны. Але, далібог, наша літаратура не заслугоўвае таго, каб і надалей ад яе імя імкнуліся прамаўляць графаманы й проста хворыя людзі.

# Ганс вялікі і Ганс малы

Гаворка ня йдзе пра адступніцтва або здраду клясычнаму правапісу як прынцыпу. Новыя правілы дадуць нам падставу гаварыць пра адну беларускую мову на постсавецкім этапе яе разьвіцьця. Хоць новы правапіс, безумоўна, запатрабуе далейшага рэфармаваньня. Піша **Сяргей Дубавец**.

Гісторыя гэтай праблемы такая. Напачатку мінулага стагодзьдзя беларуская мова ня мела свайго правапіснага нарматыву. І тады рэдакцыя газэты «Наша Ніва» даручыла маладому навукоўцу Браніславу Тарашкевічу ўнармаваць правапіс.

Тарашкевіч задачу выканаў, і ўся Беларусь пісала па-беларуску аднолькава да 1933 году. У 1933-м адбыўся раскол. Саўнаркам БССР правёў «моўную рэформу», якая мела жорсткі рэпрэсіўны і русіфікатарскі характар. Ставілася задача «спрашчэньня» беларускага правапісу і «набліжэньня» яго да расейскага. У выніку большасьць навукоўцаў-мовазнаўцаў была расстраляная ці сасланая ў ГУЛАГ, а саму беларускую мову сталі называць «грубай» (дзіва што, на пісьме больш не перадавалася мяккасьць жывых беларускіх гукаў). З гэтага часу ўсталяваліся два правапісы, якія сёньня называюць «тарашкевіцай» і «наркамаўкай». Першым правапісам да ўзьяднаньня 1939 году пісала Заходняя Беларусь, пасьля — эміграцыя, а з 1980-х гадоў — практычна ўсе новыя выданьні дэмакратычнага кірунку. Другім карысталася ўсё дзяржаўнае і афіцыйнае: улада, сыстэма адукацыі, СМІ і выдавецтвы.

На парозе абвяшчэньня незалежнасьці, на мяжы 1980-х і 1990-х гадоў канфлікт двух правапісаў акрэсьліўся як канфлікт, галоўным чынам, этычны. Нельга пісаць паводле рэпрэсіўнага нарматыву. Асабліва, калі мы ўсе жывем у чаканьні суду над злачынствамі камунізму. І датуль, пакуль ніхто з упаўнаважаных і аўтарытэтных асобаў краіны ня выказаўся з асуджальнай ацэнкай рэформы 1933 году, само карыстаньне «наркамаўкай» выглядала маўклівым далучэньнем да сталінскага генацыду.

Сёньня мы стаім напярэдадні зьяўленьня трэцяга правапісу. Праект новай рэдакцыі «Правілаў беларускай артаграфіі і пунктуацыі» падрыхтавала Міністэрства адукацыі. Неўзабаве новыя правілы стануць законам.

Візуальна гэта будзе мадэрнізаваная «наркамаўка». За тым выключэньнем, што ў нас, прыхільнікаў «тарашкевіцы», больш няма падставаў для этычнага канфлікту. Бо афарбоўваць крывёю бальшавіцкіх злачынстваў правілы, прынятыя ў незалежнай Беларусі XXI стагодзьдзя, — тое самае, што вінаваціць падлетка Ганса ў ваенных злачынствах ягонага дзеда-нацыста.

Што замінае нам прыняць новыя правілы ў якасьці адзіных? Прынцыпы? Дык варта задумацца пра цану, якая некалі будзе заплочана за нашы прынцыпы.

Генэтычна яны — адно, Ганс вялікі і Ганс малы. Але малому трэба жыць сёньня, ня чуючы на кожным кроку кінутага на адрас дзеда — «Ганьба!».

Параўнаньне зь беларускай мовай, аднак, кульгае ў тым сэнсе, што немцы за пасьляваенны пэрыяд здолелі ня толькі адбудавацца, але й аб’яднацца ў адно цэлае, а беларусы апынуліся перад чарговым раздробленьнем.

Трэба прызнаць, што мы, ініцыятары «тарашкевіцы», за мінулыя 20 гадоў так і ня здолелі стварыць уласнага адзінага руху. Наадварот, сёньня мы ператварыліся ў сэкту, бо абралі для існаваньня паралельны сьвет. Замест таго, каб дамагацца зьменаў у афіцыйным правапісе, мы здаволіліся закрытымі асяродкамі сваіх выданьняў і ніяк не сутыкаемся з тым, што прынята называць моваю школы. Калі ў часы перабудовы мы на агульнанацыянальным узроўні патрабавалі вярнуць традыцыйную назву сталіцы — «Менск» і іншых гарадоў, дык сёньня нам дастаткова таго, што мы так пішам у сваіх асяродках, тым часам ва ўсебеларускай дыскусіі гэтае пытаньне ўжо даўно не стаіць. Зь іншага боку, справядлівыя па сутнасьці этычныя аргумэнты супраць «наркамаўкі» прыводзяць для дэзарыентацыі карыстальнікаў мовы, у тым ліку й адносна новых правілаў. Сапраўды, каму захочацца пісаць «лукашэнкаўкай»? Выходзіць, што гэта і мы таксама сеем сумнеў у галаве маладога беларуса, які, выбіраючы мову іспытаў пры паступленьні ў ВНУ, раздумаецца («тарашкевіцай» — ня можна, «наркамаўкай» — брыдка, «лукашэнкаўкай»… ды пайшло яно ўсё!..) і будзе здаваць па-расейску.

* * *

Калі ў часы абвяшчэньня незалежнасьці Беларусі ў 1991 г. тарашкеўчыкі жылі спадзевам на пагаджальную канфэрэнцыю, якая б асудзіла злачынствы камунізму, у тым ліку і ў дачыненьні да мовы, дык потым чакалі, што «лясьне рэжым», зь якім пра мову гаварыць не было сэнсу. Запас трываласьці гэтага чаканьня аказаўся такім вялікім, што напрыканцы 1990-х нават быў выйграны суд «Нашай Нівы» зь Дзяржкамдрукам за права пісаць клясычным правапісам. Важна, што на тым судзе наш прынцып быў падтрыманы практычна ўсёй нацыянальнай моўнай прафэсурай. Але з таго моманту (10 гадоў назад) якраз гэты запас пачаў таяць на вачах. Многія тарашкевічныя мовазнаўцы адышлі ад справаў, доўгачаканая новая нармалізацыя «клясыкі» зьявілася кулюарным парадкам і аказалася надта далёкай ад жыцьця. Урэшце першапачатковая задача — думаць маштабам нацыі — была страчаная на карысьць захаваньня прынцыпаў, якія даўно сталі кухоннымі.

Некаторыя й сёньня яшчэ чакаюць, калі «лясьне рэжым». Але лёгіка гісторыі падказвае іншае. Рэжым ня лясьне ніколі, пакуль альтэрнатыва яму будзе сядзець на кухні. На зьмену гэтаму правіцелю прыйдзе іншы,

напэўна, для беларушчыны ня лепшы. Сёньня мы маем ужо цэлую плойму канфармістаў у чыстым выглядзе. Але і з нас дысыдэнты, трэба сказаць, ніякія. Мы не адмаўляемся, як Ларыса Геніюш, ад савецкага грамадзянства, ад пашпарту з «капустай» і аўтамабільных нумароў з «закатам над балотам». І гэта пры тым, што Беларусь — незалежная, пра што Геніюш магла толькі марыць.

Гаворка ня йдзе пра адступніцтва або здраду клясычнаму правапісу як прынцыпу. Новыя правілы даюць нам падставу казаць пра адну беларускую мову на постсавецкім этапе яе разьвіцьця. Новы правапіс, безумоўна, патрабуе далейшага рэфармаваньня — вяртаньня мяккіх знакаў, пераднаціскнога «я»… Але рабіць гэта трэба на ўсеагульным узроўні, а не ў закрытых асяродках, што не інтэграваныя ў агульнанацыянальны моўны працэс, які без удзелу гэтых асяродкаў выглядае скалечаным і ня надта жыцьцяздольным.

Што замінае нам прыняць новыя правілы ў якасьці адзіных? Прынцыпы? Дык варта задумацца пра цану, якая некалі будзе заплочана за нашыя прынцыпы.

* * *

Вядома, новыя правілы могуць быць зганьбаваныя ўжо толькі за тое, што ўводзяцца пры аўтарытарным постсавецкім рэжыме. Але гэта нашая краіна і мы — такія ж складнікі гэтага рэжыму, як і ўсе астатнія. Мы лічым сябе пратэстным электаратам, але самое жыцьцё ператварае нас у цынікаў і падмочвае нашыя прынцыпы ў вачох наступнікаў. «Чаму яны не змагаліся за старажытныя сымбалі й мяккія знакі? Таму што здаволіліся, што карыстаюцца гэтым самі?..»

Няма сэнсу тут казаць пра тое, што ў адной мовы могуць быць два й болей нарматыўныя правапісы. Бо новыя правілы не даюць мовазнаўчай гардыні падставаў называць іх «наркамаўкай» і не пакідаюць аніякіх важкіх апраўданьняў далейшай правапіснай раздробленасьці. Нам патрэбная візуальна адна беларуская мова. Адна для ўсіх — і для афіцыёзу, і для апазыцыі, і для школы, і для друку. Інакш вакол расейскага слана будзе ўвіхацца ды брахаць усё больш і ўсё драбнейшых мосек, і ўсё больш яны будуць «разьбірацца» не са сланом, а паміж сабою.

Мы павінныя выйсьці на сытуацыю штучна створанага парытэту беларускай і расейскай моваў. Адзін на адзін. І тады звычайны беларускі чалавек аднойчы спытаецца ў сябе самога — а чаму гэта «Панарама» ў нас не беларуская? І чаму Прэзыдэнт у нас — не беларускі? І чаму нашая школа — не беларуская?..

Сёньняшняя Беларусь — постсавецкая і аўтарытарная — далёкая ад ідэалу, які нам мроіцца. Але пакуль мы не адчуем сябе яе часткай, нічога ня зьменіцца.

**Паводле газэты «Свабода»**

**А што Вы думаеце пра гэта?**
**Пішэце нам.**
**Наш адрас: а/с 537, 220050 Менск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29**


Пытайцеся ў распаўсюднікаў новы нумар




падпісны індэкс 00345

# Працэсы ідуць

## Чарговыя суды над беларускамоўнымі актывістамі ў цэнтры ўвагі правінцыйных гарадоў

**Насьце Азарцы** — 1 млн 240 тыс. штрафу, школьніка **Івана Шылу** прызналі вінаватым, але вынесьлі толькі папярэджаньне. **Адвакатка Марыяна Сімашка** на працэсе: «Хаця я ня маю права рабіць прамых ацэнак, але лічу дзейнасьць «Маладога Фронту» карыснай для Беларусі, і яна будзе праз нейкі час ацэнена належным чынам». **Пракурор**: «Неператварайце звычайную справу ў палітычную. Мы судзілі б тут нават сябра незарэгістраванага таварыства хамячкоў».

## Салігорск

Аказалася, што даехаць раніцай да Салігорску — не такая лёгкая справа. Першыя маршруткі і аўтобусы ў горад гарнякоў ад'яжджаюць толькі пасьля восьмай раніцы. Такім чынам, можна было не пасьпець да пачатку працэсу, які быў заплянаваны на 10:00. Ехаць зь некім з грамадзкіх актывістаў таксама не хацелася, бо была рэальная рызыка быць перахопленым міліцыянтамі яшчэ па дарозе, таму вырашаў паехаць зьвечара.

Як потым высьветлілася, я быў не адзін такі. Ужо пасьля поўначы за распаўсюд улётак у Салігорску былі затрыманыя Іван і Ільля Шылы, Зьміцер Ясевіч, Тацяна Буланава, Франак Вячорка і Сяргей Клюеў. Пасьля некалькіх гадзін знаходжаньня ў пастарунку іх выпусьцілі.

Іван Шыла — апрануты ў прыгожы сьветлы строй — разам з бацькамі зьявіўся перад будынкам суду хвілін за дзесяць да пачатку працэсу. Здавалася, што хлопец амаль не хваляваўся.

Хтосьці выйшаў з суду са словамі: «Сьпяшайцеся, у залі практычна няма вольных месцаў». Усе зьдзіўлена пацiскалі плячыма, бо ў суд яшчэ амаль ніхто не заходзіў. Як Іван і прасіў, на ягоны працэс выдзелілі самую вялікую залю суду, прыкладна на 60 месцаў. Аднак большасьць месцаў з самай раніцы занялі... сацыяльныя пэдагогі салігорскіх школ, якіх абавязалі прыйсьці на працэс.


ЗЬМІЦЕР ПАНКАВЕЦ
**Бацька і сын Шылы.**

Сядзячых месцаў не хапала, частка людзей стаяла ў задніх шэрагах. Судзьдзя Валянціна Лапіна папрасіла выйсьці з залі тых, каму не хапіла месцаў. Маці Івана Сьвятлана на гэта адрэагавала: «Сядзем на падлогу, але з залі ня выйдзем». Праз некаторы час прынесьлі дадатковыя лавы.

Ад пачатку ў залі знаходзіўся чалавек з камэрай, які вёў запіс. Іван папрасіў, каб здымкі былі спыненыя, на што пракурор Чарнышэвіч адзначыў, што апэратар афіцыйна акрэдытаваны. Аднак Шыла настойваў, і судзьдзя ўзяла бок хлопца. Апэратар разам з маладзенькай журналісткай сышлі на вуліцу, дзе працягнулі здымаць.

Тыя ж, хто не патрапіў у залю, праводзілі акцыю падтрымкі пад сьценамі суду: 60—70 чалавек разгарнулі расьцяжкі «Маладого Фронт не спыніць», «Зараз не 1937-ы». Амаль адразу пад'ехалі аўтобусы з АМАПаўцамі, якіх спэцыяльна прывезьлі зь Менску. У людзей пачалі забіраць расьцяжкі, некаторых запіхвалі ў аўтобусы і таўклі. Агулам затрымалі восем чалавек.

Тым часам Іван Шыла прапанаваў судзьдзі адразу вынесьці прысуд, бязь лішніх фармальнасьцяў. «Давайце пашкадуем час і сілы людзей, якія прыйшлі сюды замест таго, каб знаходзіцца на працы. Прысуд усё адно ўжо даўно вядомы», — адзначыў Шыла. Яго бацька Ўладзімер пагадзіўся з прапановай сына. Вінаватым хлопец сябе не прызнаў.

Іван катэгарычна адмовіўся даваць любыя паказаньні. «Гэта ўсё адно нічога ня вырашыць і ня зьменіць», — сказаў ён і дэманстратыўна сеў на лаву падсудных. Пракурор пачаў зачытваць паказаньні Івана ад 26 траўня. На большасьць пытаньняў падчас таго допыту хлопец адказаў «ня ведаю ці ня помню».

Допыт сьведкаў, сярод іх большасьць было міліцыянтаў, быў хуткім. Праваахоўнікі расказалі, як неаднаразова затрымлівалі Івана з налепкамі ці расьцяжкамі. Уласна пра «Малады Фронт» нічога сказана не было. Апроч таго, што Івана лавілі з транспарантам «Свабоду Зьмітру Дашкевічу». «А Вы ведаеце, хто такі Зьміцер Дашкевіч?» — запытаўся Ўладзімер Шыла. — «Не». — «Тады адкуль Вы ведаеце, што гэта кепскі чалавек?» Адказу на гэтае пытаньне ўжо не прагучала. Адзін зь міліцыянтаў ахарактарызаваў Шылу наступным чынам: «Он как бы лідер».

Пасьля суд пачаў знаёміцца з матэрыяламі справы. Аказалася, што ў справе фігуруе нават той факт, што Іван зьяўляўся каардынатарам кампаніі па беларусізацыі грамадзкага транспарту Салігорску. Дарэчы, кампанія была падтрымана мясцовымі ўладамі. І прыпынкі гарадзкіх аўтобусаў цяпер абвяшчаюць і па-беларуску.

Фігуравалі раздрукоўкі артыкулаў з інтэрнэт-сайтаў, выразкі з газэт, а таксама раздрукоўкі тэлефонных размоваў Івана. Адвакатка Марыяна Сімашка адзначыла, што нават падчас працэсу пяці маладафронтаўцаў суд не разглядаў матэрыялы з сайтаў, а таксама праслухоўваньне тэлефонаў, бо гэта было зроблена без адпаведных санкцый і экспэртызы. Салігорскі суд вырашыў разглядаць гэтыя матэрыялы.

Была зачытаная характарыстыка з школы, дзе Івана назвалі «эгацэнтрычным падлеткам, які ўвесь час хоча быць у цэнтры ўвагі». Уладзімер Шыла адмовіўся даваць характарыстыку сыну.

Ля будынку суду АМАП

зноў пачаў затрымліваць людзей. Агулам восем чалавек аказаліся ў Салігорскім РУУСе, на іх склалі пратаколы за дробнае хуліганства і прызначылі на наступны дзень суд. Ноч маладзёны правялі ў пастарунку.

Падчас судовых спрэчак пракурор Чарнышэвіч папрасіў асудзіць Івана без пакараньня. Гэта ён патлумачыў тым, што Іван непаўнагадовы, таму ня можа быць кінуты ў турму або на хімію. Паколькі Шыла нідзе не працуе, ён таксама ня можа быць аштрафаваны. Пракурор перасьцярог, каб не ператваралі «звычайную справу» ў палітычную. «Мы нават судзілі сябра незарэгістраванага таварыства па гадоўлі хамячкоў», — сказаў ён.

Адвакат Марыяна Сімашка зазначыла, што няма ніводнага прамога доказу ўдзелу Івана ў «Маладым фронце». Яна таксама заявіла, што хаця ня мае права рабіць ніякіх ацэнак, але «лічыць дзейнасьць МФ пазытыўнай і карыснай для Беларусі, і яна будзе празь нейкі час ацэнена належным чынам».

Пасьля апошняе слова ўзяў Іван Шыла. «Сёньня судзяць не канкрэтна мяне, сёньня судзяць усіх, хто ня згодны з гэтай сыстэмай. Сёньня адбываецца суд над грамадзянскай абыякавасьцю. Гэта ўсё адбываецца з маўклівай згоды ўсіх нас, нават тых, хто прысутнічае ў залі, і гэтая ненармальнасьць абурае», — сказаў Іван Шыла. Ягоная прамова скончылася авацыямі залі.

Перад самым агучваньнем прысуду ў залю прарваўся Павал Севярынец, які ў гэты самы дзень быў вызвалены зь берасьцейскай турмы і пабываў на працэсе ў Нясьвіжы.

Судзьдзя Лапіна ўрэшце прызнала Івана вінаватым, вынесшы яму перасьцярогу.

На прыступках суду Івана сустракалі з кветкамі.Іван быў нешматслоўны: «Цяпер важна падтрымаць тых, хлопцаў і дзяўчат, якія цяпер знаходзяцца ў РУУСе».

Сьпяваючы «Магутны Божа», калёна, паперадзе якой ішлі Іван і Ўладзімер Шылы, а таксама Павал Севярынец, накіравалася да пастарунку. Такога Салігорск, напэўна, яшчэ ня бачыў. Нехта зь мінакоў у разгубленасьці сказаў: «Сёньня проста нейкі дзень беларускай мовы».

**Зьміцер Панкавец,**
**Салігорск—Менск**

# Нясьвіж



СЯМЁН ПЕЧАНКО

**Маці Насты Азаркі, спадарыня Зоя, прыйшла падтрымаць дачку.**

Ранішні Нясьвіж сустрэў дажджом і пільнымі міліцыянтамі, што ўважліва разглядалі ўсіх незнаёмых маладых людзей. На аўтавакзале сустракаю Насту Азарку ў атачэньні сяброў і знаёмых. З Клецку, даведаўшыся пра суд зь інтэрнэту, прыехаў падтрымаць яе Сяргей Панамароў.

На кожным перакрыжаваньні стаяць патрулі, якія «перадаюць» нас чарговаму пасту. Ззаду з адсутным выглядам цягнецца дзядзька недвухсэнсоўнага выгляду.

Каля суду мігціць уваччу ад міліцыянтаў. У двары мясцовага РУУС чакае аўтобус з АМАПам. У двары дзяжурыць здымачная група БТ, прысутныя пазнаюць Дзяніса Бальшакова, аўтара сюжэтаў пра порначасопісы на Плошчы. Карэспандэнт радыё «Свабода» робіць фота на памяць, ад чаго дзяржаўныя журналісты відавочна ніякавеюць ды адмаўляюцца ад камэнтароў.

Падцягваюцца людзі — зь Менску Алесь Міхалевіч, Павал Красоўскі з Жодзіна. Побач знаходзяцца прадстаўнікі амбасадаў ЗША і Славакіі. Іх вітае галоўны ідэоляг Нясьвіжу сп.Карнюшкін. Наста наадрэз адмаўляецца назваць прозьвішча судзьдзі: «Не хачу псаваць загадзя рэпутацыю чалавеку, ад якога й так нічога не залежыць».

Пачынаецца суд. Старшынюе судзьдзя Марыя Дунаева. На пачатак паседжаньня не зьявіліся сем сьведак. Адзін зь іх, супрацоўнік УКДБ Менскай вобласьці, адсутнічаў па ўважлівай прычыне і ягоныя паказаньні са згоды бакоў заслухалі пазьней. Калі прысутных сьведак на час просяць пакінуць залю, мама Насты Зоя Андрэеўна, заяўленая ў якасьці сьведкі, адмаўляецца ад гэтай ролі: «Як я, мама, буду сьведчыць супраць дачкі?»

Сьведкі збольшага міліцыянты. Узгадваюць, як затрымлівалі Насту за расклейваньне налепак, вывешваньне расьцяжкі з надпісам «Свабодку Дашкевічу!». Опэрупаўнаважаны крымінальнага вышуку прыгадвае пра ператрусы на кватэры Азаркі, у часе якіх канфіскавалі агітацыйныя матэрыялы — газэты, дыскі, налепкі.

Тым часам за вакном мітусяцца міліцыянты — жанчына паспрабавала разгарнуць сьцяг. Затрымаць яе не далі. Тады людзі ў цывільным схапілі журналістаў, што фатаграфавалі здарэньне. Сяргей Сыс ды Ўладзя Грызін гадзіну правялі ў пастарунку.

У часе перапынку высьвятляецца, што група падтрымкі павялічылася. На вуліцы стаяць палітыкі і праваабаронцы, пад'ехалі маці былых палітвязьняў, зьявілася Эніра Браніцкая. Яны суцяшаюць маму Насты, якая на пытаньне пра ўражаньні ад працэсу здолела выціснуць зь сябе толькі адно: «Цяжка».

Сяргей Панамароў пахваліў нясьвіскага ідэоляга, маўляў, спакойна тут у вас, а ў Салігорску сёньня дзяцей пабілі. На што прысутныя пачулі — «Ды ў нас жа гасьцінны горад!»

Пасьля паўзы працягваецца азнаямленьне з рэчавымі доказамі віны. «Пошта ад Севярынца», — зачытвае судзьдзя Дунаева. У гэты момант за вакном суду зьяўляецца і сам «доказ».

Дзяржаўны абвінаваўца па пунктах пералічвае доказы незаконнай дзейнасьці Насты Азаркі. Гэта й агітацыя за арганізацыю, і паклёп на БРСМ, а таксама ўдзел у паседжаньнях незарэгістраванай арганізацыі, вывешваньне расьцяжак ды раздрукаваныя інтэрвію з розных інтэрнэт-сайтаў. Але з улікам добрых характарыстык зь месцаў працы пракурор просіць абмежавацца штрафам у памеры 500 базавых адзінак (15 млн. рублёў).

У сваім выступе адвакат Галіеў заявіў, што артыкул, паводле якога судзяць Насту, не адпавядае сучаснаму заканадаўству й патрэбны толькі пэўным асобам у Беларусі. Сказаў, што ня можа быць складу злачынства ва ўдзеле ў арганізацыі, якая мае культурніцкія, адукацыйныя мэты, што такая арганізацыя мусіла б быць падтрыманая дзяржавай, і заклікаў спыніць справу.

Азарка ў апошнім слове сказала, што прызнае сваю памылку, што гуляла ў дзіцячыя гульні, скакала вышэй галавы. Але заявіла, што ня спыніць дзейнасьці й будзе працаваць у тым самым рэчышчы надалей, і будзе дамагацца, каб арганізацыю зарэгістравалі. Цягам працэсу Наста заяўляла, што дзейнічае адна, згодна з уласнымі матывамі. Яна часткова прызнала сваю віну.

У 15 гадзінаў Азарцы вынесьлі прысуд: 40 базавых адзінак (1 млн 240 тысячаў) штрафу. Паведамленьне пра неабходнасьць сплаціць 8 тысячаў рублёў за судовыя выдаткі выклікала абурэньне ў залі, некалькі чалавек выгукнулі «Ганьба!».

«Я чакала, што прысуд будзе нашмат больш жорсткі, — кажа Наста. — І я лічу, што мы вытрымалі гэты іспыт — і я, і ўсе тыя, хто мяне падтрымліваў».

**Сямён Печанко,**
**Нясьвіж—Менск**

# Беларусь хоча далучыцца да эўрапейскай энэргасыстэмы

Гэта адна з прапановаў, якія прывёз у Брусэль намесьнік міністра замежных справаў **Валер Варанецкі.**

Адзіная энэргасыстэма для энэргетыкі — гэта тое самае, што НАТО для бясьпекі. У цяперашні час Эўрасаюз будуе ўстаўку пастаяннага току між польскім горадам Элк і Алітусам у Літве. Гэта б зьвязала балтыйскую электрасыстэму з агульнаэўрапейскай і гарантавала б ад нацыянальных збояў.

У падобным падлучэньні зацікавілася і Беларусь. Яна прапануе Эўракамісіі задзейнічаць лінію электраперадач «Рось-Беласток». Тая мае напругу 220 кілавольт. «Калі там збудаваць устаўку пастаяннага току, перавесьці гэтую лінію на напругу 400 квт, зьявіцца магчымасьць стварэньня транспартнага колца «Эўрасаюз-Беларусь-Эўрасаюз», — кажа начальнік упраўленьня пэрспэктыўнага разьвіцьця і інвэстыцый Міністэрства энэргетыкі Беларусі Ўладзімер Баброў.

Баброў падкрэсьліў, што беларуская прапанова выклікала цікавасьць у Эўракамісіі і будзе абмяркоўвацца.

Тэхнічна гэты праект не такі складаны, як польска-літоўскі, бо ён можа быць ажыцьцёўлены ў калідоры ўжо існых лініяў, шляхам простага зьмяненьня іх напругі і прапускной здольнасьці.

Баброў падкрэслівае, што гэтае пытаньне мае стратэгічную важнасьць для Беларусі. Беларусь мае таксама лініі для пастаўкі электрычнасьці ў Польшчу зь Бярозы і для атрыманьня электрычнасьці з Чарнігава і Чарнобылю (Украіна). Канцэпцыя энэргабясьпекі прадугледжвае і пабудову лініі Роўна-Мікашэвічы для паставак з Ровенскай АЭС.

Няспынны ціск «Газпрому» і Крамлю вымусіў Беларусь, сьледам за іншымі цэнтральнаэўрапейскімі краінамі, задумацца. Дагэтуль істотную долю электрыкі Беларусь закупляла ў Расеі.

> Намесьнік міністра замежных справаў Беларусі: «Беларусь і ЭС павінны пераходзіць ад простага гандлю да больш прагрэсіўных формаў эканамічнага ўзаемадзеяньня. Беларускі бок запрашае эўрапейскіх інвэстараў у стратэгічныя сфэры эканомікі».

Эўракамісія скіравала запрашэньне Ўкраіне й Малдове далучыцца да Цэнтральнаэўрапейскай энэргасыстэмы. «Стварэньне адзінага электраэнэргетычнага масіву з удзелам Беларусі, які падтрымае адзін другога, жыцьцёва неабходнае», — мяркуе супрацоўнік Міністэрства энэргетыкі.

З гэтай і іншымі прапановамі ў Брусэлі пабываў намесьнік міністра замежных справаў Беларусі Валер Варанецкі. 3 верасьня ён выступіў там на міжнароднай канфэрэнцыі па пытаньнях так званай «эўрапейскай палітыкі добрага суседзтва», якая распаўсюджваецца на суседзяў ЭС ад Альжыру да Расеі.

У сваім выступе В. Варанецкі заявіў, што Беларусь гатовая да супрацы з ЭС у энэргетыцы, транспарце, транзыце, сельскай гаспадарцы, навуцы. Сапраўднай сэнсацыяй прагучалі ягоныя словы, што «Беларусь і Эўрасаюз павінны пераходзіць ад простага гандлю да больш прагрэсіўных формаў эканамічнага ўзаемадзеяньня. Беларускі бок запрашае эўрапейскіх інвэстараў у стратэгічныя сфэры эканомікі: энэргетыку, машынабудаваньне, хімічную і нафтаперапрацоўчую прамысловасьць» (цытата БелТА).

Такога раней беларускія афіцыйныя прадстаўнікі не гаварылі. Гэта якраз тыя галіны, кантролю над якімі брутальна дамагаюцца расейскія карпарацыі.

«Нашым краінам час на справе пераходзіць да фармаваньня агульнай канкурэнтнай эканамічнай прасторы на эўрапейскім кантынэнце, да стварэньня адзіных тэхналягічных ланцужкоў, адзіных лагістычных і транзытных схем. Бяз гэтага Эўропа будзе прайграваць у глябальным эканамічным спаборніцтве», — сказаў намесьнік кіраўніка беларускага МЗС.

Цікава, што расейская прэса анансавала прыезд у Брусэль віцэ-прэм'ера Ўладзімера Сямашкі, але беларускі бок абверг гэтыя чуткі.

**Мікола Бугай**

## Якая будзе цана на газ у 2008-м?

«Формулу можна па-рознаму чытаць, і на якую велічыню падвышаць цану на газ — гэта пытаньне», — паясьнілі журналістам у «Белтрансгазе». Цана будзе зразумелая толькі да сярэдзіны студзеня, калі канчаткова складзецца цэнавая кан'юнктура. Таму ў Менску напярэд гатовыя да традыцыйнай перадгнавагодняй спрэчкі з «Газпромам».

Кантракт прывязвае цану газу для Беларусі да «сярэднеэўрапейскай» мінус падаткі і транспартныя выдаткі. Аднак што такое сярэднеэўрапейская цана, ніхто ня ведае. Калідор эўрапейскіх цэнаў — 250—300 дал. за 1 тыс. куб. м.

Пасол Расеі назваў лічбы 125—150 даляраў за кубамэтар як магчымая цана газу для Беларусі.

**МБ**

## СЬЦІСЛА

### Прапанова даляраў адстае ад попыту

Гэта можа азначаць працяг пагаршэньня стану замежнага гандлю, мяркуе газэта «Белорусы и рынок». Паводле вынікаў жніўня прапанова даляраў на Беларускай валютна-фондавай біржы скарацілася на 39% да аналягічнага паказчыка 2006 г. Яна на 34,2% ніжэйшая за попыт і склала $338,4 млн. Падобная сытуацыя і з эўра.

### Перавытворчасьць цукру

У часе наведваньня Скідзельскага цукровага камбінату прэм'ер Сяргей Сідорскі паведаміў, што беларускі бок разьлічвае прадаць расейцам увесь цукар, выраблены ў 2007-м. Расея гэтага не камэнтуе. Пакуль беларуская квота на продаж — 180 тыс. т. Аб'ём жа вытворчасьці складзе 420 тыс. т.

### Скачок цэнаў на малако

Апошнія паўгоду трымаецца выгадная кан'юктура на рынках малакапрадуктаў. У параўнаньні з 2006 г. сярэднія цэны на сухое малако і казэін вырасьлі ўдвая.

**СП**

# Тыдзень халодны, верасень звычайны


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

На гэтым тыдні ў Беларусі чакаецца халаднаватае і дажджлівае надвор’е. Тэмпэратура паветра апусьцілася да 15—20 градусаў. У канцы тыдня вільготнае паветра з-над Балтыкі прынясе кароткачасовыя дажджы.

Што да верасьня, то, як чакаецца, па тэмпэратуры і ападках ён будзе блізкі да сярэдніх шматгадовых значэньняў. Сярэдняя тэмпэратура складзе 11—13 градусаў цяпла. Гэта будзе клясычны верасень з умерана цёплым надвор’ем, дажджамі і невялікім перапынкам на «бабіна лета».

**СМ**



### «Плянаў разьмяшчэньня расейскай ядзернай зброі ў Беларусі няма»

«У Беларусі ёсьць свой статус, замацаваны ў яе канстытуцыі, і ў цэлым на гэтым пытаньне вырашанае», —заявіў міністар замежных спраў Расеі Лаўроў на брыфінгу ў панядзелак у Маскве.

**ЯС**

## ЗЬМЕНЫ

### Інтэрнэт больш папулярны за тэлевізію

З найноўшых дасьледаваньняў, праведзеных па замове IBM, вынікае, што ўсё болей людзей у разьвітых краінах аддаюць перавагу інтэрнэту перад ТВ. Цэлыя 19 % анкетаваных праводзіць у інтэрнэце 6 гадзінаў штодзень, у той час як толькі 9 % гэтулькі ж часу глядзіць тэлевізію. 60 % дасьледаваных сядзіць перад кампутарам па 1—4 гадзінаў у дзень, а 66 % столькі ж часу бавіць перад тэлеэкранам.

**Вольга Данішэвіч**

# Махляр падмануў Беларусь на 4 мільёны

Апэратыўнікі дэпартамэнту па барацьбе з арганізаванай злачыннасьцю МУС РФ затрымалі ў Маскве прадпрымальніка, які падазраецца ў махлярстве з пастаўкамі нафтапрадуктаў у Беларусь на суму каля 4 млн даляраў, паведаміла ў панядзелак РІА «Новости», крыніца ў расейскіх сьледчых органах.

Падазраваны быў зытрыманы надоечы ў офісе сваёй фірмы, разьмешчаным у цэнтры Масквы. Яго імя ў інтарэсах сьледзтва не паведамляецца, паведамляе тая ж крыніца.

Паводле зьвестак МУС Беларусі, затрыманы ўклаў дамовы на пастаўку для ўзброеных сілаў рэспублікі дызэльнага паліва на суму 98,8 мільёну расейскіх рублёў, але абавязальніцтваў сваіх ня выканаў і зьнік.

Як паведаміла крыніца, мужчына арыштаваны судом, пра ягонае затрыманьне паведамілі ў МУС Беларусі. Вырашаецца пытаньне пра экстрадыцыю падазраванага.

**АГ**

# Лябедзька і Калякін маглі загінуць


PHOTO.BYMEDIA.NET

Лідэры АГП і ПКБ Анатоль Лябедзька і Сяргей Калякін 31 жніўня позна вечарам вярталіся зь Берасьця.

«Недалёка ад Стоўпцаў мы пачалі адчуваць, што з заднім колам нашага аўтамабіля нешта не ў парадку, — кажа А.Лябедзька. — Мы зьехалі на ўзбочыну. Амаль адразу да машыны пад’ехалі міліцыянты з аўтаматамі, якія пачалі дапытваць, што здарылася. Мы сказалі, што маем праблемы з заднім колам. Калі мы пачалі яго аглядаць, то высьветлілася, што ўсе чатыры балты кола адкручаныя».

А.Лябедзька кажа, што з машынай не было ніякіх праблем да таго моманту. «Пад Бярозай мы спыніліся ў прыдарожнай кавярні. У гэты час да кавярні пад’ехаў нейкі мікрааўтобус, адкуль выйшлі чатыры чалавекі. Кіроўца бачыў, што адзін зь іх аблакаціўся на нашу «Міцубісі». Пасьля ўжо мы падумалі, што ён мог правяраць, ці была ўключана сыгналізацыя. У кавярні мы сядзелі хвілін 30, што робіцца з машынай, бачыць не маглі».

**Зьміцер Панкавец**

## СЬЦІСЛА

### Шушкевіч: «Ні ў якую сэкту я не ўваходжу»

БТ зьвінаваціла **Станіслава Шушкевіча** ў прыналежна-сьці да «Царквы Аб’яднань-ня», прызнанай у Беларусі дэструктыўнай сэктай. С.Шушкевіч абверг: «Ні ў якую сэкту я не ўваходжу, а сустракаўся зь лідэрам царквы Мунам на сьвецкіх


AP

прыёмах. Гэтая царква ў іншых краінах сэктай ня лічыцца. З Мунам і Гарбачоў сустракаўся». Шушкевіч перакананы: правакацыя зьвязаная зь яго вылучэньнем на Нобэля.

**Зьміцер Панкавец**

### «Хочам вучыцца па-беларуску» ў Горадні

У межах акцыі «Хочам вучыцца па-беларуску» моладзь правяла флэш-моб падчас канцэрту на Савецкай плошчы. Гарадзенцы прыйшлі на канцэрт з падручнікамі беларускай мовы і селі на плошчы з разгорнутымі кнігамі.

### Дэманстрацыя за Беларусь у Нью-Ёрку

8 верасьня Беларускі Моладзевы Рух Амэрыкі ладзіць дэманстрацыю супраць судоў над беларускамоўнымі юнакамі ў Беларусі. Пачатак аб 11.00 перад будынкам ААН.

**МБ**

# Факты — упартая рэч

Беларусь спрабуюць уцягнуць ва ўнутрырасейскія палітычныя гульні. Піша **Віталь Тарас**.

Пры канцы лета лідэр Камуністычнай партыі Расеі Генадзь Зюганаў падзяліўся плянамі сьвяткаваньня 90-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі. Як паведаміў кіраўнік расейскіх камуністаў, галоўныя мерапрыемствы пройдуць 4—5 лістапада ў Менску. І толькі ўрачысты сход 6-га адбудзецца ў Маскве. Ну, а дэманстрацыі й мітынгі 7-га павінныя прайсьці ва ўсёй Расеі. Адзін з высокіх функцыянэраў КПРФ пазьней дадаў, што на сьвяткаваньне запрошаныя лідэры камуністычнага й рабочага руху зь некалькіх дзясяткаў краінаў — у тым ліку таварыш Рауль Кастра з Кубы і дэлегацыя Партыі працы з КНДР.

## Назад, у калыску РСДРП!

Чым выкліканае жаданьне расейскіх камуністаў правесьці большую частку сваіх сьвяточных мерапрыемстваў — зразумела. Акрамя жаданьня падкрэсьліць сымбалічнае значэньне братэрскага саюзу Беларусі й Расеі на сучасным этапе, ёсьць і больш празаічныя прычыны.

Па-першае, 7 лістапада засталося «чырвоным лістком календара» толькі ў Беларусі. Нідзе больш на постсавецкай прасторы, у тым ліку і ў Расеі, гэты дзень не адзначаецца ў якасьці дзяржаўнага сьвята.

Па-другое, юбілей Кастрычніка адбудзецца меней як за месяц да выбараў у расейскую Думу. Між тым, 4 лістапада, які цяпер афіцыйна адзначаецца ў Расеі як Дзень народнага адзінства, зарэзэрваваны пуцінскай «Адзінай Расеяй». Так што месца для ўра-патрыятычнага піяру ў гэтыя дні ўжо занятае галоўнымі прэтэндэнтамі на перамогу на сёлетніх выбарах у ніжнюю палату расейскага парлямэнту.

Давядзецца КПРФ піярыць сябе з суседняй Беларусі, пад размовы пра інтэграцыю.

Ніякіх тлумачэньняў з боку афіцыйнага Менску наконт масавага заезду камуністаў у беларускую сталіцу, які мае адбыцца ў лістападаўскія дні, мы пакуль ня чулі. (І нават праграмы гэтых сьвяткаваньняў жыхары сталіцы ня ведаюць.) Але нейкай незадаволенасьці ў сувязі з намерам КПРФ выкарыстаць імя Лукашэнкі падчас сваёй выбарчай кампаніі ды правесьці тут граендыёзнае сьвята пад чырвонымі сьцягамі кіраўнік дзяржавы таксама ня выказаў.

Магчыма, усё гэта дыктуецца ўсяго толькі палітычным момантам, зьвязаным з парлямэнцкімі ды прэзыдэнцкімі выбарамі ў Расеі. Да палітычных манэўраў уладаў РБ усе ўжо прызвычаіліся — сёньня так, а заўтра можа быць інакш, у залежнасьці ад абставінаў. Тым больш, што камуністам ня ўдасца набраць у Думе галасоў больш, чым ім загадзя вызначана Крамлём.

Але ж тут бачацца падставы для размовы на больш грунтоўную тэму. Чаго на гэтым фоне вартыя размовы пра тое, што незалежнасьць Беларусі сапраўды зрабілася для сёньняшняй улады неад’емнай каштоўнасьцю — як пра тое неаднойчы заяўляў кіраўнік дзяржавы, а за ім паўтаралі ды паўтараюць дзяржаўныя чыноўнікі розных рангаў?

## «Раніцой у газэце...»

У адным зь нядаўніх выпускаў перадачы «Праскі акцэнт» на радыё «Свабода» Юры Дракахруст задаў сваім суразмоўцам пытаньне: чаму ў той час, як дачыненьні Менска й Масквы яўна сапсаваліся праз нафтагазавы канфлікт і ў афіцыйнай прэсе пануе незалежніцкая, часам антырасейская рыторыка — у школы вяртаюцца падручнікі, дзе гісторыя выкладаецца з ранейшых, расейскацэнтрычных пазыцыяў? Як спалучыць незалежніцкую рыторыку з выхаваньнем «савецкага патрыятызму» ў духу «Кароткага курсу ВКП(б)»? Удзельнікі перадачы — аўтарытэтныя гістарыёграфы — адказалі на пытаньне па-рознаму. Але першы адказ быў самы просты — падручнікі ўсё ж ня прэса. Яны рыхтуюцца досыць доўга. І калі на нейкім этапе ў праграмах па гісторыі дамінoўнай зрабілася канцэпцыя найбольш адыёзных аўтараў — такіх, як Трашчанок альбо Новік, — імгненна «павярнуць» гэтыя праграмы ў адпаведнасьці з выступамі першай асобы дзяржавы альбо зь перадавым артыкулам у «Советской Белоруссии» немагчыма.

Гэтае тлумачэньне хоць і выглядае натуральным, выклікае жаданьне сёе-тое ўдакладніць.

За савецкім часам зьмест ня тое што падручнікаў, але нават энцыкляпэдычных выданьняў сапраўды мог зьмяняцца імгненна, на загад уладаў. Амаль як у сатырычных радках: «Раніцой у газэце — увечары ў куплеце». У ролі «куплетаў» маглі апынуцца любыя выданьні. А калі не было тэхнічнай магчымасьці нешта паправіць, кнігі проста сканфіскоўвалі. Вядомы выпадак, калі выдавецтва «Вялікай Савецкай энцыкляпэдыі» разаслала падпісчыкам паперу з просьбай вярнуць атрыманы імі апошні том выданьня як памылковы! І пераважная большасьць падпісчыкаў пакорліва вярнула «няправільныя» тамы…

Ці можна сабе ўявіць, каб на другі дзень па выхадзе ў сьвет працы таварыша Сталіна «Пытаньні мовазнаўства» хоць якая-небудзь публікацыя ў гэтай галіне абышлася без таго, каб на кожнай старонцы не цытаваўся правадыр? Гэта справа даўно мінулых дзён, і ў сучаснай Беларусі такое не практыкуецца. Але ўзьнікае больш істотнае пытаньне. А што казаў кіраўнік дзяржавы за апошні час такога, што пярэчыла б

«масквацэнтрычным канцэпцыям» у найноўшых падручніках па гісторыі? І што магло б аўтараў адыёзных падручнікаў навесьці на думку, быццам прыйшоў час чарговай «перастройкі» у мазгах?

## Марксісты ў «Мэрсэдэсах»

Нягледзячы на інвэктывы ды пагрозы на адрас расейскіх алігархаў ці нават самога Пуціна, Лукашэнка нідзе й ніколі не казаў, што ён зракаецца савецкага мінулага разам з усімі савецкімі мітамі.

Што тычыцца дзяржаўнай незалежнасьці — дык пра яе, сапраўды, вышэйшыя чыноўнікі пачалі гаварыць як пра недатыкальную каштоўнасьць. Было б дзіўна, калі б чыноўнікі ўсіх рангаў, убудаваныя ва ўладную вэртыкаль, не ўсьвядомілі важнасьць і карыснасьць для сябе незалежнасьці. Незалежнасьці, найперш, ад Крамля і пуцінскай вэртыкалі ўлады. Але ж незалежнасьць для паноўнай эліты пакуль ня ёсьць, як кажуць філёзафы, «рэччу ў сабе». Каб яна зрабілася «рэччу для сябе», стала сапраўды зьмястоўнай каштоўнасьцю, эліта павінна ўзьняцца над сваімі карпаратыўнымі інтарэсамі.

Але як гэта можа адбыцца, калі ў гэтай эліты альбо намэнклятуры няма ўласнай ідэалёгіі? Сёньняшняя дзяржаўная ідэалёгія, якой прасякнутыя тыя самыя падручнікі гісторыі, цалкам перайманая. І складаецца яна з аскабалкаў так званай камуністычнай ідэалёгіі. Чаму так званай? Ды таму, што тая ж КПРФ, якая лічыць сябе сьцяганосцам камуністычных ідэяў і якой шчыра сымпатызуе лідэр Беларусі, мае вельмі ўскоснае дачыненьне да марксізму-ленінізму. Увогуле, яе й палітычнай партыяй у поўным сэнсе гэтага слова назваць можна хіба толькі ўмоўна. Настолькі яна ўбудаваная ў сучасную дзяржаўную машыну Расеі. У гэтым сэнсе апазыцыйная КПРФ ня надта адрозьніваецца ад пуцінскай «Адзінай Расеі», а яшчэ менш — ад «Справядлівай Расеі» Міронава. (Цікаўныя могуць прачытаць, як самі камуністы ацэньваюць сёньняшнюю сытуацыю ў гэтай партыі на сайце «Паліт.ру», у гутарцы з Ільлём Панамаровым.) Парадокс, але «партыя працоўных» ня толькі не падтрымала нядаўні страйк рабочых на ВАЗе, але выступіла на баку кіраўніцтва аўтагіганта! Бо менавіта ад яго адміністрацыйнага рэсурсу шмат у чым залежаць вынікі будучых выбараў у Самарскай вобласьці.

Аблічча лідэра КПРФ Зюганава, нязьменнага спаборніка за прэзыдэнцкае крэсла, які езьдзіць на «Мэрсэдэсах» апошніх мадэляў і апранаецца ў дарагія касьцюмы, мала стасуецца з аблічам бальшавіка-ленінца.

Дый права нацыяў на самавызначэньне, пра якое шмат пісаў Ленін, Зюганаў ня згадвае. Больш за тое, ён выступае з адкрыта шавіністычных пазыцыяў, у тым ліку і ў дачыненьні Беларусі. Сярод адэптаў Зюганава шмат і такіх, якія прамаўляюць антысэміцкія пагромныя лёзунгі з трыбунаў. (Успомнім хаця б генэрала Макашова.) Пра які ўжо тут марксізм можна казаць?!

## «За Радзіму, за Сталіна!»

Калі КПРФ і можна назваць пераемніцай КПСС, дык толькі таго пэрыяду, калі на чале партыі былі Сталін і Брэжнеў. Зюганаўцы й не хаваюць, што Сталін — іхны кумір.

Цікава, што КПРФ пры гэтым не адмаўляе рашэньняў XX і XXII зьездаў КПСС што да разьвянчаньня «культу асобы», але кіраўніцтва партыі раіць сваім функцыянэрам быць у гэтым пытаньні асьцярожнымі.

Тым, хто лічыць, што гісторыя — рэч суб’ектыўная, бо залежыць яна ад інтэрпрэтацыі фактаў, варта нагадаць, што факты — рэч упартая, і нікуды ад іх не падзенесься. Калі экскурсавод на «Лініі Сталіна» кажа, што гэты «абарончы рубеж» дазволіў спыніць прасоўваньне гітлерцаў на Менск на некалькі тыдняў — справа не ў «інтэрпрэтацыі». Бо немцы ўвайшлі ў беларускую сталіцу ўжо 28 чэрвеня 1941 году. А значыць, словы пра стратэгічнае значэньне «Лініі Сталіна» (дарэчы, закансэрваванай на загад правадыра напярэдадні вайны) — проста хлусьня.

Яшчэ больш яскравы прыклад — Галакост. Як вядома, за адмаўленьне самога факту Галакосту (масавага вынішчэньня гітлерцамі габрэяў падчас Другой усясьветнай вайны) у многіх краінах Эўропы саджаюць у турму. Пры гэтым, як ні дзіўна, тым, хто ўхваляе палітыку гітлерскага генацыду (не заклікаючы да яго паўтарэньня, безумоўна), крымінальная кара не пагражае. Справа, відаць, у тым, што прыватнае меркаваньне — пакуль яно застаецца ў межах меркаваньняў, а ня заклікаў — не ўяўляе такой небясьпекі для грамадзтва, як ігнараваньне фактаў гісторыі.

Пакаяньня ў злачынствах супраць чалавечнасьці, якое адбылося ў Нямеччыне, не адбылося ні ў былым Савецкім Саюзе, ні ў адной з былых камуністычных рэспублік. Хоць роўнасьць паміж гітлерскімі й сталінскімі злачынствамі падаецца ў цывілізаваным сьвеце відавочнай. Наадварот, менавіта сталінізм, сталінскі СССР, сталінская мадэль пабудовы грамадзтва і ўзаемадачыненьня нацыяў высоўваюцца сёньня ў Беларусі ў якасьці ідэалу, навязваюцца грамадзтву праз шматлкія расейскія тэлесэрыялы, кнігі, падручнікі, экскурсіі на Лінію Сталіна і нават, апошнім часам, паштоўкі з выяваю правадыра.

Здавалася б — асудзіць сталінізм, сталінскія рэпрэсіі ў гадавіну масавых расстрэлаў 1937 году ў Беларусі азначала б адначасова асуджэньне савецкага імпэрыялізму, адмову ад «масквацэнтрычнага погляду» на гісторыю, паспрыяла б росту нацыянальнай сьвядомасьці й годнасьці. Але не адбылося. Замест гэтага афіцыйны Менск гасьцінна адчыняе вароты для расейскіх камуністаў, якія лічаць сябе нашчадкамі Сталіна.

Цікава, як ставяцца да гэтага ў Партыі камуністаў беларускай, у іншых партыях левага кірунку? Будуць піць у абдымку з расейскімі таварышамі? Пад лёзунгі: «За Радзіму, за Сталіна!»?

## 28 жніўня

### Не пусьцілі

**Тацяне Севярынец** — маці асуджанага ў Берасьці на 15 сутак палітыка **Паўла Севярынца** — не дазволілі сустрэцца з сынам. Начальнік ізалятару часовага ўтрыманьня Віктар Мельнікаў катэгарычна адмовіў, спаслаўшыся на Адміністрацыйны кодэкс.

### Прысуд за «супраціў міліцыі»

Менскі гарадзкі суд пакінуў бязь зьменаў крымінальны прысуд **Кастусю Лукашову**. Раней ён быў асуджаны на два гады ўмоўна за нібыта зьдзейсьнены супраціў міліцыі. Раённы суд скаргу абароны не задаволіў. Цяпер адмовіў і Менскі гарадзкі суд.

### Ліквідавалі «зялёных»

Вярхоўны суд задаволіў пазоў Міністэрства юстыцыі аб ліквідацыі дзейнасьці беларускай экалягічнай партыі зялёных **«БЭЗ»**.

### Алейнік зможа

Рэктар Вышэйшай школы эканомікі Сяргей Караганаў даў згоду на залічэньне на факультэт дзяржаўнага і муніцыпальнага кіраваньня былога студэнта Акадэміі кіраваньня пры прэзыдэнце **Юрася Алейніка**, якога адлічылі з ВНУ па палітычных матывах.

## 29 жніўня

### Цішкевіч адмовілі

УУС Маскоўскага раёну Менску адмовіла моладзевай актывістцы **Тацяне Цішкевіч** у завядзеньні крымінальнай справы па факце яе зьбіцьця супрацоўнікамі палка міліцыі спэцыяльнага прызначэньня (былы АМАП). Дзяўчыну зьбілі ў Дзень салідарнасьці 16 жніўня, калі яна спрабавала бараніць моладзевага лідэра **Мікіту Сасіма**, схопленага міліцыянтамі ў цывільным.

### Мітынг у Курапатах

У Менску і іншых гарадах адбыліся акцыі памяці загінулых у гады сталінскіх рэпрэсіяў. Акцыя праходзіць 29 дня штомесяц з нагоды масавага расстрэлу беларускіх пісьменьнікаў 29 кастрычніка 1937 г. Некалькі дзясяткаў чалавек усклалі кветкі і запалілі сьвечкі ля крыжоў у Курапатах.

## 30 жніўня

### За мову на мяжы

30 базавых велічыняў штрафу (930 тыс. руб.) далі гомельскаму актывісту **Сяргею Сямёнаву** за патрабаваньне прадставіць яму на мяжы беларускамоўны блянк мытнай дэклярацыі. Такое рашэньне вынесла судзьдзя Цэнтральнага суду Гомеля **Марына Даменка**.

### Спэцназ разагнаў

У Магілёве затрыманьнем скончылася сьвяткаваньне дня народзінаў моладзевай актывісткі **Тацяны Буланавай**. Восем байцоў зводнай роты хуткага рэагаваньня пад кіраўніцтвам маёра **Сяргея Андрээнкі** нечакана блякавалі гасьцей Тацяны ў лесапаркавай зоне ды пачалі даглядаць асабістыя рэчы. Частку людзей затрымалі ды даставілі ў РУУС Магілёўскага раёну. Не знайшоўшы зачэпкі для складаньня пратаколу, міліцыянты выклікалі супрацоўніка МНС, які склаў пратакол па факце распальваньня вогнішча ў неадпаведным месцы.

### Зьнялі зь цягніка

Позна ўвечары супрацоўнікі міліцыі Асіповічаў затрымалі актывіста Моладзі БНФ **Арцёма Дубскага** на выхадзе зь цягніка й прапанавалі прайсьці ў пастарунак у якасьці сьведкі. Арцём адмовіўся, але ў пастарунак яго ўсё адно адвялі ды склалі пратакол выманьня асабістых рэчаў: газэты «Права на Волю», кнігі П.Севярынца «Лісты зь лесу», 44 значкаў «За Свабоду». Рэчы адправілі на экспэртызу.

**СП**

## 5 верасьня

### На сутках у Салігорску будуць сядзець Каліта і Атакулава

У Салігорску судзілі дзевяць затрыманых падчас акцый салідарнасьці зь Іванам Шылам пад сьценамі салігорскага суду моладзевых актывістаў. **Кася Галіцкая**, **Віктар Дзенісевіч**, **Дзяніс Карноў**, **Зьміцер Хведарук** і **Франак Вячорка** атрымалі па 5 б.в. штрафу (155 тысяч рублёў). **Тацяна Буланаву** аштрафавалі на 4 б.в. **Зьміцер Ясевіч** атрымаў папярэджаньне. На сем сутак за парушэньне парадку правядзеньня масавых акцый пасадзілі **Алеся Каліту** і **Людмілу Атакулаву**.

**ЗП**



CHARTER97.ORG

**1 верасьня прайшла ўрачыстая лінейка незалежнага Гуманітарнага ліцэю імя Якуба Коласа. Вучні, бацькі і выкладчыкі сабраліся каля будынку на Кірава, 21, адкуль Ліцэй быў выгнаны ў 2003. Ліцэй пасьпяхова правёў набор, сёлета ў ім будзе каля 90 навучэнцаў. На фота: перад ліцэістамі выступае нязьменны дырэктар Уладзімер Колас.**

# «Гарадзкія гульні» Ўладзімера Кандрусевіча

Сакавітая выстава мастака, які не пайшоў па салонным шляху, у «ЛаСандр-арце».



Машына заглухла нечакана — як гэта яна заўжды робіць. Угаворы ні да чаго не прывялі. Я параіла ёй падумаць над сваімі паводзінамі, узяла торбу і пакрочыла па Раманаўскай слабадзе. Каб не пачынаць дзень зь непрыемнасьці, каб вярнуць раўнавагу, вырашыла зайсьці ў галерэю «ЛаСандр-арт», што трапіла на шляху. Зайшла і зразумела: як добра, што машына заглухла!

У «ЛаСандр-арт» экспануецца выстава Ўладзімера Кандрусевіча «Гарадзкія гульні» — пятнаццаць палотнаў, аб'яднаных тэматычна і па часе стварэньня... Мне падалося, што я трапіла ў Менск сноў. Мне падалося, што так Менск яшчэ ніхто не пісаў. Пазнавальныя сюжэты, пазнавальныя тыпажы, і кожны — чалавек з душой. Ці мастак жыве сярод такіх душэўных людзей, ці ён надае ім душу падчас стварэньня карціны? Загадка мастацтва. У мастака свой погляд, востры і добры.

Хаця на палотнах амаль няма менскіх архітэктурных і пэйзажных рэалій, але горад вельмі пазнавальны. Мянчанкі зь міндалевіднымі вачыма — сама сутнасьць прыгажосьці, падлеткі гуляюць у сокс, старыя, у тварах якіх адлюстроўваецца плынь жыцьця, алканаўты і эмігранты... «Я нарадзіўся, вырас і сталеў у Менску. Што ж мне яшчэ пісаць, калі не яго? Большасьць сюжэтаў я падгледзеў тут, але, мусіць, яны будуць цікавыя і жыхарам іншых гарадоў», — гаворыць мастак.

Дырэктарка галерэі, мастацтвазнаўца Ларыса Бортнік дадае: «Наша галерэя разьмяшчаецца тут, на Раманаўскай слабадзе, 24, з 2000 году. Сфэра нашых зацікаўленасьцяў — гэта беларуская мастацкая школа другой паловы XX стагодзьдзя і тыя з маладых мастакоў, хто вырас з гэтай традыцыі. Працы Кандрусевіча нас зацікавілі менавіта з гэтай прычыны. Малады мастак не пайшоў па шляху салоннага жывапісу, яго манера — вельмі своеасаблівая — блізкая да рэалізму. Ён адчувае нэрв гораду, ён заклікае нас не забывацца, што вакол многа тых, каму жывецца нялёгка... Важна і тое, што Ўладзімер працягвае творчую дынастыю — ён унук вядомага беларускага мастака Натана Воранава. А ўвогуле экспазыцыя ў нас зьмяняецца прыкладна раз на месяц, заходзьце!»

Ясная рэч, зайду! Ня так і шмат у Менску месцаў, дзе, проста адчыніўшы дзьверы з вуліцы, можна атрымаць столькі станоўчых эмоцый.

**Наталка Бабіна**




PHOTO.BYMEDIA.NET

**1 верасьня адбылася цырымонія закладкі першага каменя ў падмурак спартова-аздараўленчага комплексу на месцы стадыёну «Трактар». САК будзе складацца з футбольнага стадыёну на 15 000 месцаў, спартова-канцэртнай залі і ўсякіх іншых заляў. На адкрыцьці прысутнічалі кіраўнік Адміністрацыі прэзыдэнта Генадзь Нявыглас (на фота справа) і прэзыдэнт фірмы-забудоўніцы UBIG, літоўскі бізнэсовец Уладзімер Раманаў (зьлева), дырэктарка UBIG Рыта Матузэне. На фота: яны аглядаюць будучыя вабноты.**

## Пяць хлопцаў згарэлі жыўцом

Моладзь 17—21 гадоў у вёсцы Вербавічы Нараўлянскага раёну сьвяткавала дзень нараджэньня бібліятэкаркі дому культуры. Пяцёра хлопцаў, выпіўшы, паснулі на ложках... Аб пажары паступіла паведамленьне а шостай гадзіне раніцы. Пасьля ліквідацыі пажару на папялішчы былі знойдзены целы чатырох хлопцаў, якія моцна абгарэлі. Адзін чалавек з апёкамі 60% цела быў адпраўлены ў Гомель у апёкавы цэнтар.

## Вывозіў у Польшчу для прастытуцыі

На 39-гадовага непрацуючага жыхара Баранавічаў распачата справа па ч. 2 арт. 181 Крымінальнага кодэксу (гандаль людзьмі). Паводле зьвестак сьледзтва, мужчына са жніўня 2002 па люты 2004 г., выкарыстоўваючы цяжкае матэрыяльнае становішча непрацуючых жыхарак райцэнтру 1983 і 1980 гадоў нараджэньня, завэрбаваў іх і ня раз вывозіў у Польшчу для прастытуцыі.

## У падземным пераходзе завяліся карасі

Падземны пераход на перакрыжаваньні праспэкту Будаўнікоў і вуліцы Петруся Броўкі ў Віцебску пачалі будаваць на пачатку 1980-х. За гэты час ён запоўніўся вадой, зарос асакой. Сёлета ў даўгабудзе завяліся карасі.

## Над Польшчай сутыкнуліся два самалёты

Трагедыя здарылася ў Радаме — гэта цэнтральная частка Польшчы. У суботу, падчас міжнароднага сьвята авіяцыі, у паветры сутыкнуліся два самалёты. На вачах тысячаў гледачоў загінулі двое лётчыкаў, чальцоў акрабатычнай групы «Жалезны». Прычынай выпадку была, найхутчэй, памылка пілёта.

## Памёр піянэр дзіцячай хірургіі

У Бэрліне на 73-м годзе жыцьця памёр вядомы дзіцячы хірург прафэсар Юрген Вальдшміт. У 1970-я Вальдшміт адным зь першых дзіцячых хірургаў у Эўропе пачаў ужываць апэратыўныя мэтодыкі бяз скальпэлю. У 1990-я ён навучаў падобным тэхналёгіям беларускіх калегаў. Сёньня ўсе яны зь вялікай удзячнасьцю згадваюць нямецкага калегу і выказваюць смутак з нагоды ягонай сьмерці.

## 29 вычарпаны, пачынаецца 33

Апэратар сотавай сувязі СТАА «Мабільныя ТэлеСыстэмы» аб'явіў аб пачатку падключэньня абанэнтаў на нумары з новым занальным кодам сеткі 33. Новыя абанэнты «МТС» могуць атрымаць нумары з дыяпазону 6000000-6299999, якія маюць новы занальны код 33.

## Карстэн — пяціразовая чэмпіёнка сьвету

У Мюнхене прайшоў чэмпіянат сьвету па акадэмічным веславаньні. Кацярына Карстэн



(Хадатовіч) не пакінула ніякіх шанцаў сваім суперніцам і стала пяціразовай чэмпіёнкай сьвету. Таксама яна мае два залатыя мэдалі Алімпіяд (Атлянта-1996 і Сыднэй-2000). Апошнія гады Кацярына жыве ў Нямеччыне, на радзіме мужа. Золата ў алімпійскай дысцыпліне заваявала і наша двойка-распашная ў складзе Юліі Бічак і Натальлі Гелах. Някепская пэрспэктыва вымалёўваецца перад Алімпіядай у Пэкіне, якая пройдзе праз год. У Мюнхене беларускія весьляры, апроч мэдалёў, заваявалі яшчэ дзьве алімпійскія ліцэнзіі.

## П'яная ў дым жанчына разьбілася ў Малінаўцы

У Менску п'яная жанчына без правоў села за стырно аўтамабіля «Таёта» і на скрыжаваньні вуліц Ясеніна і Касманаўтаў сутыкнулася з «Фальксвагенам». Дурніца мела 2,4 праміле алькаголю ў крыві. У аварыі пацярпелі дачка нецьвярозай кіроўцы, якая з чэрапна-мазгавой траўмай трапіла ў бальніцу, а таксама дзіця 2006 году нараджэньня, якое ехала ў «Фальксвагене».

## У Ляхавіцкім раёне ваўкі напалі на вёску

Ваўкі напалі на вёску Лотва Ляхавіцкага раёну. Людзі не пацярпелі, аднак драпежнікі пакусалі трусоў і гусей. Цяпер трое вяскоўцаў праходзяць курс прышчэпак ад шаленства, бо яны датыкаліся да пакусаных жывёлаў.

**СМ, ЗП; «Звязда», БелаПАН, Эўрарадыё, Польскае радыё для замежжа, gazeta.pl**

## «Да сумленьня Вашага ніхто апрача Вас самых ня мае доступу»

**Адкрыты ліст старшыні Рады БНР Івонкі Сурвілы да настаўнікаў Беларусі з нагоды пачатку новага школьнага году.**

«Нічога так моцна мяне не задавальняе, як быць настаўнікам ды выхоўваць дзетак, якія будуць уважаць сваім абавязкам прычыніцца да дабрабыту нашага сьвету...» Так аднойчы гаварыў усім ведамы ў Канадзе настаўнік Юстын Трудо, сын найбольш ведамага канадзкага прэм’ер-міністра П’ера Трудо.

Дарагія настаўнікі Беларусі, як прыемна было б пачуць, што Вы таксама выбралі гэтую прафэсію, каб зрабіць з нашых беларускіх дзетак лепшых Беларусаў, з пачуцьцём адказнасьці за будучыню сваё Бацькаўшчыны, за зьберажэньне сваё культуры і свае мовы.

Вельмі ж прыкра чуць юнакоў, якія прыязджаюць зь Беларусі на летні адпачынак у Канаду ды дзівяцца, што нехта ў Канадзе гаворыць па-беларуску...

Мы тут гэтую мову шануем і ўважаем нашым агульнабеларускім скарбам. Пачуцьцё гэтае стараемся перадаць нашым дзецям. Уявеце сабе іхнае расчараваньне, калі прыехаўшы ўпершыню ў Беларусь яны чуюць мову чужую, не беларускую. А ад Вас залежыць у вялікай меры павага ў Беларусі да свае мовы, да ўсяго беларускага, бо Вы зьяўляецеся найбольшым аўтарытэтам для сваіх вучняў.

У жыцьці кожнага з нас былі настаўнікі, якія зрабілі на нас вялізарны ўплыў. Некаторыя з нас выбралі прафэсію дзеля свайго захапленьня настаўнікам ці настаўніцай. Уплыў настаўнікаў на наш сьветапогляд, на людзкія вартасьці, якіх мы будзем прытрымоўвацца да канца жыцьця, бясспрэчны. У нашым сьвеце, дзе бацькі праводзяць штораз менш часу з сваімі дзецьмі, таму што змушаныя абое працаваць, ад Вас залежыць будучыня нашага народу і нашага краю.

Што рэжым у Беларусі антыбеларускі, гэта ўсім ведама. Але ж да сумленьня Вашага ніхто апрача Вас самых ня мае доступу. Сваім прыкладам настаўнік можа зрабіць болей як усе ўказы дыктатара.

Зьвяртаюся да Вас сёньня з просьбай: выхоўвайце ў беларускім духу нашых дзетак, каб яны не цураліся свайго. Каб яны былі гордыя, сьмелыя, прынцыповыя. Каб разумелі, што Беларусь — іхная Бацькаўшчына і што іхным сьвятым абавязкам ёсьць яе бараніць ад чужых імпэрыялістычных намераў.

Вы, дарагія настаўнікі Беларусі, можаце як ніхто іншы адрадзіць беларускую Беларусь! Сілаў і мужнасьці Вам у Вашай ахвярнай працы».

## Бяздумныя Дажынкі

**Усенароднае сьвята «Дажынкі» праводзіцца па старадаўняй традыцыі пад восень.** У нашай краіне з гэтай урачыстасьці зрабілі нейкі ўсенародны культ, а рыхтавацца да яго пачынаюць задоўга і ўсёй грамадой. Праўда, у апошнія гады падрыхтоўка да «Дажынак» зводзіцца да парадкаваньня таго населенага пункту, дзе гэтае сьвята будзе адбывацца.

У гэтым годзе абласныя «Дажынкі» адбудуцца ва ўтульным мястэчку Жабінка.

Аднак на пытаньні: што і як парадкуюць, адказы не зусім зразумелыя.

Напрыклад, чысьцяць, паглыбляюць і спрошчваюць рэчышча рачулкі Жабінкі. Але ці падумалі парадкавальнікі, што гэта дасьць? Ці пралічылі агульны вадасьцёк? А нашто павысякалі дрэвы ўздоўж ракі? Гэта ж зьменіць узровень грунтовых водаў. Ці не ператтворыцца ў выніку праз 2–3 гады рэчка Жабінка ў багністую канаву?

А хто санкцыянаваў разворваньне абалоні той жа Жабінкі каля камбікормавага заводу і пабудову тут аўтастаянкі?! Гэта ж водаахоўная тэрыторыя, дзе забароненая любая сельскагаспадарчая дзейнасьць!

Чаму вернуць зямлю ў водаахоўнай зоне каля рэчкі Мухавец пад вёскай Зьдзітава, дзе раскапалі цэлы кар’ер, зьнялі чорную зямлю і вывезьлі яе ў гарадзкі парк, каб выраўняць тэрыторыю, якая чамусьці падалася няроўнай?!

А калі палічыць да гэтага сюю-тую «драбязу» накшталт зносу і будаўніцтва мосту цераз р.Жабінку, перабрукоўку гарадзкой плошчы, асушэньне і чыстку паркавага ставу, маляваньне фасадаў дамоў, што выходзяць на цэнтральныя вуліцы, рамонт дарожных пакрыцьцяў і г.д., то само сабой узьнікае наступнае пытаньне: «А за чый кошт гэты банкет?» Ці вытрымае небагаты бюджэт мястэчка? І ці не будуць супрацоўнікі жабінкаўскіх прадпрыемстваў працаваць пасьля Дажынак некаторы час практычна задарма?

**Глеб, tut.by**

## УДАКЛАДНЕНЬНЕ

У «НН» №37 была зьмешчаная падборка запісаў Франца Сіўка «А цыцкі ў іх ёсьць?» З тэхнічных прычынаў у ня быў надрукаваны фрагмэнт, які даў загаловак падборцы:

«У Сэліна («Сьмерць у крэдыт») у згадцы пра размовы французаў аб падрабязнасьцях жыцьця ангельцаў: «Асабліва іх цікавіла гародніна, ці праўда, што яны яе жаруць сырою... Ці праўда, што там у жанчын даўгія зубы? Зусім як у коней? А ногі? Праўдзівае сьмяхоцьце? А ці цыцкі ў іх ёсьць? Усё гэта прамаўлялася з намінкамі і тысячамі грымасаў».

Як бы наш айчынны філістэр успрыняў такія пасажы ў дачыненьні, напрыклад, — ах, даруй, Божа! — да расіянаў?

Рэдакцыя прыносіць прабачэньні аўтару.

# У Эўропе не сустрэнеш на вуліцы п’яных Эўразьвяз практычна выкараніў гэтую зьяву

Пра неабходнасьць увесьці забарону на расьпіцьцё слабаалкагольных напояў на вуліцах пастаянна кажа МУС Рэспублікі Беларусь. Але ва ўладных структурах ініцыятыва міліцыі пакуль не выклікае падтрымкі. «Цяпер народ не зразумее» — кажуць чыноўнікі. Народ сапраўды не зразумее забарону — як і любую іншую. Але, напрыклад, практычна ўва ўсіх краінах Эўразьвязу гэтая забарона існуе — і не выклікае мітынгаў пратэсту. Затое і п’янага на вуліцы там практычна не сустрэнеш…

Нядаўна нават Расея загаварыла пра неабходнасьць барацьбы зь півам на вуліцах і ў сквэрах — там плянуецца стварыць працоўную групу па падрыхтоўцы дапаўненьня ў фэдэральны закон і папаўненьня пераліку месцаў, дзе расьпіцьцё будзе забаронена.

## Як Эўропа разабралася з спажываньнем алькаголю на вуліцах?

Проста забараніла. Пакуль не на ўзроўні Эўразьвязу, але нацыянальныя ўрады і органы мясцовага самакіраваньня актыўна рэалізуюць забарону на практыцы. Нядаўна ўлады бэльгійскага гораду Льежу забаранілі расьпіваць алькаголь на вуліцах і ў грамадзкіх месцах. Паліцыя павінна пільна сачыць за захаваньнем новага правіла. Паслабленьні будуць рабіцца толькі ў сьвяточныя дні для кавярняў і закусачных, разьмешчаных на тэрасах, і тое з папярэдняга дазволу муніцыпалітэту. Гэта жорсткі закон. Напрыклад, у Гішпаніі, Польшчы, Літве і іншых краінах ужо даўно забаранілі расьпіваць піва на лавачцы. Але там гэта дазволена ў вулічных кавярнях.

Што паказальна, там, дзе ўводзілі забарону на расьпіцьцё піва на вуліцах, канстатавалі: колькасьць нецьвярозых грамадзянаў, якія, хістаючыся, цягнуцца па ходніках, рэзка скарацілася. Адпаведна, скарацілася колькасьць антыграмадзкіх учынкаў.

## Піць павінна быць дорага

Дадзеныя Ўсясьветнай Арганізацыі Здароўя сьведчаць, што праблемы, зьвязаныя з алькаголем, каштуюць Эўропе 235 млрд даляраў у год.

Так што паралельна з забаронай на расьпіцьцё сьпіртнога на вуліцы ў Эўразьвязе рэалізуюцца і іншыя меры, такія як забарона рэклямы алькаголю (але ня брэндаў) і, пакуль не паўсюль, павелічэньне цэнаў на сьпіртныя напоі.

Сур’ёзнага павелічэньня цэнаў дамагаецца Швэцыя. У 2005 урад Швэцыі пачаў маштабную рэклямную кампанію, спрабуючы пераканаць кіраўніцтва ЭЗ і жыхароў кантынэнту ў неабходнасьці жорсткай палітыкі адносна продажу і ўжываньня алькаголю. У Швэцыі сьпіртное можна набыць толькі ў спэцыяльных дзяржаўных крамах, якія працуюць да 16.00. І сьпіртное там нашмат даражэйшае, чым у большасьці краінаў Эўразьвязу.

У наступным годзе ў Эстоніі падатак на алькаголь павялічыцца на 30%. Прычына — празьмернае ўжываньне алькаголю насельніцтвам краіны і «пітны» турызм зь Фінляндыі. Фінскі ўрад з радасьцю ўспрыняў навіну пра ўвядзеньне падатку. І цяпер, кіруючыся эстонскім прыкладам, яны падымуць падаткі і ў сябе — на 10% на піва і на 15% — на мацнейшыя напоі.

Эстонскія экспэрты мяркуюць, што алькаголь забівае ад 1500 да 2000 чалавек у год — і гэта ў адной з найменшых дзяржаваў Эўразьвязу.

## Замест высноваў

У маленькай Эстоніі штогод ад алькаголю гіне да 2 тысячаў, у Беларусі гэтая статыстыка прапарцыйна павінна быць на ўзроўні 8–10 тысячаў. П’ем мы, у розьніцу на душу насельніцтва, аднолькава — прыкладна па 12 літраў на кожнага, уключаючы старых і немаўлятаў. І варта было б ужо пачынаць улічваць эўрапейскія тэндэнцыі, не спасылаючыся на «цяпер народ не зразумее».

**Там, дзе ўводзілі забарону на расьпіцьцё піва на вуліцах, колькасьць нецьвярозых, якія, хістаючыся, цягнуцца па ходніках, рэзка скарацілася. Адпаведна, скарацілася колькасьць антыграмадзкіх учынкаў.**

Дадзеная публікацыя падрыхтаваная пры спрыяньні Эўразьвязу і не абавязкова адлюстроўвае афіцыйны пункт гледжаньня ЭЗ.
Па дадатковую інфармацыю зьвяртайцеся на сайт www.delblr.ec.europa.eu

# Чарадзей
## між Кастрычніцкай і Эўфрасіньнеўскай

4,5-тонны манумэнт — найбольшы на сёньня конны помнік у Беларусі. Піша **Сяргей Харэўскі**.



**Першы конны Ўсяслаў.**

Стылістыка помніку анахранічная для нашага часу, аднак спадабалася правінцыйнаму чынавенству больш, чым імпрэсіяністычны Ўсяслаў аўтарства Алеся Шатэрніка.

Усталяваньню помніку Чарадзею папярэднічаў колькігадовы конкурс. Сярод вераемных аўтараў былі й Алесь Шатэрнік і Сяргей Бандарэнка, але замову на выраб манумэнту атрымаў Аляксандар Прохараў.

Гэты скульптар ужо зьвяртаўся да вобразаў нацыянальнае гісторыі. У яго даробку ёсьць помнік Кірылу Тураўскаму, што ў дворыку Белдзяржунівэрсытэту. На 80-годзьдзе БДУ яго ўрачыста адкрываў рэктар Аляксандар Казулін.

Аляксандар Прохараў быў блізкі да перамогі й у Менску, вырабіўшы эскіз мастакоўскае аздобы, у садружнасьці з Паўлам Вайніцкім, для новае футбольнае арэны на колішнім праспэкце Машэрава. Яго скульптурная кампазыцыя «Арбіта спорту» ў 2003 г. была цёпла сустрэтая і калегамі, і начальствам. Гэта мелася быць дынамічная кампазыцыя з кольцаў і фігураў, што мусіла б паволі рухацца вакол фантану. На жаль, задуму Прохарава ня зьдзейсьнілі.



**Альтэрнатыўны праект Алеся Шатэрніка.**

Не рэалізаваны пакуль і яшчэ адзін выдатны праект гэтага скульптара — мэмарыял у Трасьцянцы, дзе быў адзін з найбуйнешых у Эўропе лягераў сьмерці. За праект мэмарыялу А.Прохараў з калегамі-архітэктарамі атрымаў Гран-пры за найлепшы праект на I міжнародным конкурсе маладых архітэктараў «Леанарда 2005».

Такім чынам, посьпех Аляксандра Прохарава ў Полацку, быў для яго прынцыповым.

Паводле словаў працаўніка Полацкага гарвыканкаму Станіслава Красоўскага, на 4,5-тонны помнік Усяславу не было выдаткавана ані капейкі зь бюджэту. Усе 300 млн рублёў, якія ён каштаваў, — прыватныя ахвяраваньні.

Бронзавы Ўсяслаў Чарадзей, з сокалам, імчыць на кані на скрыжаваньні вуліцаў Кастрычніцкай і Эўфрасіньні Полацкай. Скульптар прыбраў неабавязковыя дэталі манумэнту, што былі ў эскізе. Цяпер яго сылюэт выдатна глядзіцца. Стылістыка помніку анахранічная для нашага часу, аднак была добра ўспрынятая, зразуметая правінцыйным чынавенствам — больш, чым імпрэсіяністычны Ўсяслаў аўтарства Алеся Шатэрніка. Урэшце, конных статуяў у Беларусі вобмаль. І патрабаваньні да іх, пакуль, дыдактычныя і дэкаратыўныя.

Нягледзячы на вялікую колькасьць манумэнтаў у нашай старажытнай сталіцы, бальшыня зь іх не адыгрывае свае ролі. Ані нягеглыя бэтонныя Леў Таўстой зь Леніным, ані новыя бронзавыя Эўфрасіньня й Сімяон Полацкія не кранаюць душу, не выклікаюць належнага асацыятыўнага шэрагу. Мо рамантычны герой, віцязь у ваўчынай скуры, на борздым кані, больш будзе адпаведны месцу й часу? А мо праслаўліцца якімі чарамі?

# Дзякуй

**Алесю Г.** з Баранавіч.
**Вользе А.** зь Любанскага раёну.
**Генадзю Л.** з Гомелю.
**М.Я.** з Жодзіна.
**Генадзю Б.** з Шклоўскага раёну.
**Сяргею Ц.** зь Бягомлю.
**Андрэю М.** з Новалукомлю.
**Іне С.** з Барысава.
**Паўлу Д.** зь Івацэвіч.
**Міхаілу Т.** са Слуцку.
**Ліліі В.** зь Берасьця.
**Тацяне Р., Веры С., Валеру К., Вользе К., Вользе А., М.Ш.** зь Менску.

Заклікаем **чытачоў**, якія атрымліваюць газэту, але **яшчэ не прыслалі дамовы**, зрабіць гэта як найскарэй. З пытаньнямі пра дамовы, аплату і дастаўку зьвяртайцеся праз тэл.: (017) 284–73–29, (029) 260–78–32, (029) 618–54–84.


зьбяры «Кнігарню «Наша Ніва»




**Наталка Бабіна. Крыві не павідна быць відна.**




**Паветраны шар**: беларускае мужчынскае апавяданьне.


ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3012 206 280 014** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3012 206 280 014** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

КВІТАНЦЫЯ

Касір М.П.

# Каб штотыдзень атрымліваць газэту,

дасылайце адрасы і грошы за газэту. Кошт на месяц — 8 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.

2) **Просім у блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага перапказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

Па пытаньнях атрымання газэты пытайцеся Рамана.

# Героі вяртаюцца ў гісторыю

Працяг са старонкі 2.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Уладзімер Арлоў**

**нар. у 1953 ў Полацку. Пісьменьнік, гісторык. Аўтар больш як дваццаці кніг прозы, паэзіі, эсэ і гістарычных нарысаў. Сярод іх «Дзесяць вякоў беларускай гісторыі» (у суаўтарстве з Генадзем Сагановічам), «Таямніцы полацкай гісторыі», «Краіна Беларусь».**

Шмат для каго з маіх суайчыньнікаў гісторыя іх краю пачынаецца з тых часоў, калі піва каштавала 37 капеек, а гарэлка — тры рублі. Ёсьць таксама другая Беларусь, жыхары якое ведаюць мінулае краіны, маюць сваіх герояў.

Атрымаць гэтыя веды было задачаю складанай і часта пакутлівай. Калі я ў 1970-х вывучаў гісторыю, ні я, ні мае аднакурсьнікі з гістарычнага факультэту БДУ анічога ня чулі пра шматлікія важныя моманты нашае мінуўшчыны.. Мы былі прадуктамі савецкае адукацыі, у якой замоўчвалася існаваньне Беларускай Народнай Рэспублікі, ніхто нават шэптам ня згадваў пра масавыя рэпрэсіі 1930-х гадоў. Нашыя прафэсары не адкрылі перад намі гэтае забароненае гісторыі. Сёньня дзень 25 Сакавіка, калі была абвешчаная незалежнасьць БНР, ведаюць ужо амаль усе. Безумоўна, большасьць пакуль не сьвяткуе гэты дзень, аднак ён вярнуўся ў народную памяць, то бок нейкі прагрэс ёсьць.

**— Як навучалі гісторыі ў савецкай школе?**

—Што да Беларусі, дык савецкая гістарыяграфія была пераемніцаю гістарыяграфіі царскай. Беларуская гісторыя заўсёды разглядалася праз прызму імпэрскіх мітаў. Беларусы, маўляў, — малодшыя браты расейцаў, яны ня маюць права на дзяржаўнасьць, мову. У гэтай гісторыі не было месца героям, якія змагаліся за эўрапейскія каштоўнасьці. Я вырас у Полацку, а ня ведаў пра тое, што цар Іван Жахлівы, захапіўшы наш горад, зьнішчыў каталікоў і габрэяў, а 50 тысячаў праваслаўных пагнаў углыб Расеі. На ўроках і лекцыях нам апавядалі, што цар вызваліў Полацак ад палякаў і літоўцаў. Замоўчвалася, што гісторыя стасункаў Расеі ды Беларусі — гісторыя бясконцых войнаў, якія распачаліся ў 1492 годзе й доўжыліся ажно да канца XVIII стагодзьдзя, калі мара расейскіх валадароў пра заваёву Беларусі зьдзейсьнілася. У школе не вывучалі Інфлянцкай вайны, не вывучалі найстрашнейшай вайны 1654—1667 г. Беларусь страціла тады палову насельніцтва, сваю эліту, шляхту, мяшчанства. Гэта была дэмаграфічная, эканамічная, культурная катастрофа, ад якой краіна не адыйшла дагэтуль. Якраз тут мне бачацца карані нашых сучасных балючых праблемаў.

За тры гадзіны аўтобусам ад Полацку знаходзіцца славутае дзякуючы Пушкіну сяло Міхайлаўскае. У школе мы штогод езьдзілі туды на экскурсіі. Усё там я ведаў напамяць, сам мог быць гідам. Затое ніколі не зрабілі нам экскурсіі па Полацку, не распавялі пра Сафію.

**—Згадка пра існаваньне сярэднявечнага Полацкага княства супярэчыла б тэорыі пра адзіную Русь — прааййчыну ўсіх усходніх славянаў?**

—За царом, як і за саветамі, папулярызавалася тэза, што мы ніколі ня мелі ўласнае дзяржаўнасьці. А між тым Полацкае княства займала большую частку сучаснае Беларусі і адпавядала ўсім крытэрам дзяржавы. У нас была ўласная дынастыя Рагвалодавічаў, дынастычныя сувязі зь Бізантыяй. Савецкая гістарыяграфія імкнулася выкрасьліць усе нашы значныя постаці тых часоў. Напрыклад, сьвятая Эўфрасіньня Полацкая ў XII стагодзьдзі была адною з самых адукаваных жанчынаў у Эўропе. У школьным падручніку яна не была згаданая ніводным словам, як і ў падручніках унівэрсытэцкіх. Акадэмічная «Гісторыя Беларусі» налічвала ажно пяць тамоў, але пра Эўфрасіньню маўчала. Наш выкладчык сказаў толькі, што яна была царкоўнаю цемрашалкаю, а яе дзейнасьць — опіюмам для народу. І тое добра, што пачулі яе імя, і маглі самі даведацца, кім яна была насамрэч. Канспэктавалі ўсё, што дыктаваў прафэсар, а пасьля шукалі па розных кнігах, каб дакапацца хоць да якой праўды. Калі ў мяне дрэнны настрой, дастаю тыя канспэкты, чытаю і кладуся ад сьмеху.

**—Наколькі небясьпечным для Беларусі зьяўляецца міт пра адзіную Русь?**

— Ён — наша найвялікшае няшчасьце. Хоць існаваньне старажытнарускага народу не пацьвярджаюць ані археалягічныя, ані этнаграфічныя, ані антрапалягічныя дасьледаваньні, стэрэатыпы, якія моцна сядзяць у галовах беларусаў, выкарыстоўваюцца прыхільнікамі далучэньня нашага краю да Расеі. Расейскія палітыкі, як правыя, так і левыя, перакананыя, што незалежныя Ўкраіна й Беларусь— гістарычная памылка. І належыць гэтую памылку як найхутчэй выправіць.

Міт пра адзіную Русь мусіць апраўдаць прэтэнзіі Расеі на ўкраінскія ды беларускія землі. Хаця ля вытокаў гісторыі усходнеславянскіх дзяржаваў стаялі тры цэнтры: Полацак, Кіеў і Ноўгарад. Сымбалічнае значэньне ім надавалі тры Сафіі, пабудаваныя ў тых гарадох на ўзор — ня толькі архітэктурна, але й ідэалягічна — сьвятыні ў Канстанцінопалі. Трагедыяй гэтых трох асяродкаў сталася зьяўленьне чацьвертага: Масквы. У Ноўгарадзе разьвіўся асобны этнас, які Масква зваявала і фанатычна зьнішчыла. Падобны лёс рыхтаваўся і нам. Беларусы ня мелі права назвацца самастойным народам. Нам зьмянялі нават імёны. Тамаш рабіўся Фамой. Расейцы стваралі й іншыя міты пра Беларусь. Але міт пра тое, нібыта беларусы яшчэ з часоў Кіеўскае Русі былі часткаю расейскага народу, — найважнейшы і эксплюатуецца дагэтуль.

**—Да такой ступені, што частка беларусаў перакананая, нібыта беларускія землі ў XIII ст. знаходзіліся пад татарскім ярмом?**

—Так, нават сёньня нібыта сур'ёзныя людзі часам гавораць, што без дапамогі Расеі




**Наваградак — першая сталіца Вялікага княства Літоўскага.**

беларусы не вызваліліся б ад татарскага прыгнёту. Хаця ніколі беларусы пад ім не былі. Тое, што нашыя землі пазьбеглі мангольскае навалы — адна з найважнейшых адметнасьцяў нашае гісторыі. Татарскае ярмо было трагедыяй для расейскіх земляў, якія страцілі праз гэта шанцы на прыналежнасьць да эўрапейскае культуры.

Да XIII ст. у рускіх княствах існавалі дэмакратычныя традыцыі, але пасьля 250 гадоў мангольскага панаваньня ў расейскай сьвядомасьці адбыліся сур'ёзныя зьмены. Паводле азіяцкага ардынскага досьведу Масква і сфармавала сыстэму ўлады. Беларусы ж фармаваліся ў абсалютна іншых умовах.

**—Якія яшчэ падманкі ўжывала расейская й савецкая гістарыяграфія, каб даказаць тэорыю пра адзіны народ?**

—Нас кармілі байкаю, нібыта Расея ня мела калёніяў. А гэта была каляніяльная імпэрыя, толькі калёніі знаходзіліся не за морам, як у Брытаніі, а каля мяжы. Тое, што значную частку калёніяў засялялі славянскія народы, палегчыў зьнішчэньне іх памяці. Падкрэсьлівалася, што беларусы заўсёды марылі пра тое, як бы паяднацца з старэйшым братам у адзінай дзяржаве. Маё пакаленьне расло з гэтым перакананьнем. Каб гэты міт мог функцыянаваць, неабходна было замоўчваць цэлыя стагодзьдзі гісторыі, калі Беларусь знаходзілася пад уплывам заходняе цывілізацыі. Маніпулявалі нават біяграфіяй Францішка Скарыны. Яго Біблія была надрукаваная ў 1517—1519 гг. па-беларуску і зьяўляецца чацьвертаю друкаванай нацыянальнай Бібліяй у сьвеце. У школе мы чулі пра Скарыну, але расказвалі нам пра яго такім чынам, каб мы не разумелі сапраўдных маштабаў гэтай асобы. У адным з падручнікаў было напісана, што Скарына працягваў працу расейскага першадрукара Івана Фёдарава. Фёдараў выдаў першую расейскую кнігу ў 1564 г., але ж наш друкар ня мог быць першым, на гэта меў права толькі расеец.

**—Апазыцыйна й празаходне настроеныя беларусы надаюць вялікае значэньне бітве пад Оршаю (1514 г.), не хаваючы, што напамін пра перамогу над маскоўскім войскам мусіць паслужыць нацыянальнай ідэі, паводле якой вораг заўсёды на ўсходзе.**

—На захадзе таксама хапала непрыяцеляў... А сьвяткаваньне гадавіны гэтае Аршанскае бітвы дапамагае разбураць міт, нібыта на расейскіх землях жылі нашыя браты, якія несьлі нам спакой і вечна нас вызвалялі. Акрамя таго, нам неабходныя нацыяўтваральныя ідэі. Нашае грамадзтва занадта доўга засвойвала міты, якія ўтваралі комплекс непаўнавартасьці.

Дарэчы, у Польшчы бітва пад Оршаю разглядаецца як баталія з удзелам польскіх войскаў, хаця войскаў Кароны там не было, толькі аддзелы палякаў-наймітаў. Гэта войска Вялікага Княства Літоўскага разьбіла расейцаў.

**—То бок, адказныя за такі стан рэчаў ня толькі расейцы. Да гэтага спрычыніліся таксама польскія аўтары і дзеячы літоўскага адраджэньня?**

—Адзін зь мітаў— месца беларусаў у ВКЛ. У школе й ва ўнівэрсытэтах нам убівалі ў галовы, што ВКЛ узьнікла шляхам заваёвы славянскіх земляў літоўцамі. Але ж Княства паўстала на нашых землях. Першаю сталіцаю дзяржавы быў Наваградак, які знаходзіцца ў самым цэнтры сучаснае Беларусі. Там каранаваўся князь Міндоўг. Безумоўна, ува ўтварэньні ВКЛ удзельнічалі й балты, але ня шляхам заваёвы. Гэта быў пераважна мірны працэс.

**—Гісторык Генадзь Сагановіч пісаў, што ў 1991—1994 гг. беларускія гісторыкі дапусьцілі шмат спрашчэньняў адносна гісторыі ВКЛ, пераацэньваючы яго значэньне.**

—Цалкам верагодна, але

# Героі вяртаюцца ў гісторыю

пасьля дзесяцігодзьдзяў маўчаньня й забароны тых тэмаў, гэта падаецца зразумелым. Я не прыхільнік тэзы, што толькі беларусы маюць права на спадчыну ВКЛ, але падкрэсьлю, што нашыя продкі былі найбольшай паводле колькасьці народнасьцю, якая насяляла гэтую зямлю. Яны ад X ст. мелі свае гарады, пісьменства й хрысьціянскую рэлігію. Балты — продкі сучасных літоўцаў — за часамі Вітаўта ледзь складалі 5%. Ня мелі сваіх гарадоў, не былі хрысьціянамі, ня мелі пісьменства. У сучаснай эўрапейскай гістарыяграфіі назіраецца такая тэндэнцыя: пішуць, што Літва існавала ўжо ў X ст., а беларусы зьявіліся ў XVI ст. Гэта «заслуга» літоўскіх гістарыёграфаў.

Але літоўскі прыклад даказвае, што на аснове моцнага нацыянальнага міту можна сфармаваць нацыю. Калі пасьля 1918 г. зьявілася незалежная дзяржава, міты, створаныя ідэолягамі літоўскага адраджэньня, трапілі ў падручнікі. Некалькі пакаленьняў выхоўваюцца на іх і сёньня імі прасякнутыя. Друкуецца, напрыклад, кніга «Літоўскія замкі», а там Кіеў, Полацак...

**—Вас можна папракнуць у тым, што Вы агістарычна расьцягваеце паняткі «Беларусь» і «беларусы» ў часе й прасторы.**

—Лічу гэта правамерным, бо ліцьвінамі называліся тады ўсе жыхары нашых земляў. Назва Беларусь замацавалася толькі на пачатку XX ст.

Якая мова была ў ВКЛ дзяржаўнаю, на якой мове былі напісаныя яго статуты? Калі пытаем у літоўскіх гісторыкаў, кажуць, што гэта нейкая «славянская мова». Аднак бясспрэчным зьяўляецца тое, што моваю вялікакняскай канцылярыі была старабеларуская, а не літоўская. Законы пісаліся па-беларуску, і паседжаньні соймаў таксама праходзілі на гэтай мове. Калі савецкая Расея падпісала ў 1920 г. дамову зь незалежнаю Літвою, літоўцы запатрабавалі, каб ім вярнулі Мэтрыку (архівы канцылярыі) ВКЛ. Беларускі гісторык Мітрафан Доўнар-Запольскі, які быў запрошаны ў групу экспэртаў, прапанаваў вярнуць літоўцам усе дакумэнты, напісаныя палітоўску. Іх не знайшлося. Былі акты пераважна па-беларуску, а таксама па-польску, на лаціне й па-нямецку.

**— Беларуская культура ў часы Рэчы Паспалітай, а таксама пасьля яе падзелаў фармавалася ў ценю польскае. Гэта, мабыць, таксама ўплывала на бачаньне мінулага гэтае зямлі — усё, што было зьвязанае з вышэйшаю культураю, лічылася польскім.**

— Гэта чарговы міт, паводле якога беларусы былі выключна мужыцкім народам, пазбаўленым арыстакратыі. Кім, у такім выпадку, была Магдалена Радзівіл, якая падтрымлівала беларускае нацыянальнае адраджэньне? А Раман Скірмунт ці Эдвард Вайніловіч, фундатар Чырвонага касьцёлу ў Менску? Сюды ж далучаецца міт пра нейкую дзіўную санлівасьць нашага народу, які нібыта ніколі ня мог наважыцца на актыўны супраціў, а ўсе антырасейскія паўстаньні былі дзеямі польскай нацыі. Аднак жа беларусы разам з палякамі й літоўцамі тройчы ўздымалі паўстаньні. У 1794 г. і ў 1830 — 1831 гг змаганьне ішло яшчэ за адраджэньне Рэчы Паспалітае ў старых межах, але ў 1863 г. у паўстанцкіх аддзелах змагаліся людзі, якія думалі пра самастойнасьць Беларусі. Кастусь Каліноўскі выдаваў газэту «Мужыцкая праўда» па-беларуску. Пэрыяд паўстаньня быў вельмі важным для беларускага нацыянальнага адраджэньня.

**— Сёньня Каліноўскі трактуецца як галоўны герой, змагар за незалежнасьць. У якой ступені быў сьвядомы ягоны нацыяналізм?**

— Ва ўнівэрсытэце мяне вучылі, што Каліноўскі быў палякам, які гуляў у беларушчыну дзеля сваіх мэтаў. Цяпер некаторыя сьцьвердзяць, што постаць Каліноўскага міталягізаваная й беларускага нацыяналіста зь яго робяць сілком. Але Каліноўскі выдаваў газэту па-беларуску, а перад стратаю напісаў свой запавет — «Ліст з-пад шыбеніцы» таксама па-беларуску.

**— Міхаіл Мураўёў, аднак, загадаў яго павесіць як паляка й каталіка.**

— Бо ў інтарэсах расейцаў было абвясьціць, што Каліноўскі паляк. Сталін цынічна казаў: «Ёсьць чалавек — ёсьць праблема, няма чалавека — няма праблемы». Тое самае можна сказаць і пра народ. Я не прыхільнік марксізму, аднак ягоныя клясыкі трапна назвалі Расейскую імпэрыю турмою народаў.

**— Каліноўскі стаў ўзорам для моладзі, апазыцыйнай Лукашэнку, але няўжо няма шанцаў, каб ён стаўся агульнанацыянальным героем?**

— Магчыма, ёсьць. Ня ведаю, калі мы дачакаемся помніка ў Менску, але за савецкімі часамі імем Каліноўскага хаця б назвалі вуліцу. На пачатку незалежнасьці ў сыстэме дзяржаўных узнагародаў зьявіўся ордэн Кастуся Каліноўскага — адзін з найвышэйшых. Сёньня гэтай узнагароды ўжо няма. У канцы 1990-х, уключыўшы радыё, я даведаўся, што Каліноўскі быў тэрарыстам, а яго рукі заплямленыя мужыцкаю крывёю.

**— Сымбалем, да якога апэлюе дэмакратычная частка беларусаў, зьяўляецца Беларуская Народная Рэспубліка. Канец Першае сусьветнае вайны—шчасьлівы момант атрыманьня незалежнасьці народамі Цэнтральнае і Ўсходняе Эўропы. У беларусаў гэта не атрымалася. Спроба ўтварэньня дзяржавы, якая праіснавала ўсяго некалькі месяцаў, шануецца беларусамі. Ці ня маем тут справы зь міталягізацыяй БНР?**

—25 сакавіка — найважнейшая дата ў гісторыі Беларусі XX ст. Безь яе немагчыма было б мецъ тое, што мы маем сёньня. Калі б не была абвешчаная БНР, бальшавікі ніколі б не далі дазволу на стварэньне БССР. Безумоўна, незалежнасьць БССР была фікцыяй, але, урэшце, мы ўваходзілі ў ААН, у нашай назьве было слова «Беларусь». У 1991 г. гэта вельмі дапамагло атрымаць незалежнасьць. Каб не БНР, нас не было б сёньня на палітычнай мапе сьвету.

**— Палякі сёньня ня вельмі хочуць згадваць становішча, у якім знаходзілася беларуская меншасьць у Рэчы Паспалітай.**

— Палякі лічылі нашую гісторыю часткаю сваёй і таксама спрычыніліся да пазбаўленьня беларусаў гістарычнае памяці. У XX ст. Польшча, атрымаўшы незалежнасьць, пачала змагацца зь беларускім нацыянальным адраджэньнем. Зачыняліся беларускія школы. Засталася толькі адна гімназія ў Вільні. За нацыянальныя погляды кідалі ў вязьніцу. Палякі ішлі на такія брутальныя меры, як стварэньне канцлягеру ў Бярозе-Картускай. Праз яго прайшлі тысячы беларусаў. Аднак у Польшчы, адрозна ад БССР, не расстрэльвалі.

**— Савецкі пэрыяд, пасьля непрацяглай беларусізацыі 1920-х, прынёс чарговы заняпад беларускае культуры. Была ліквідаваная амаль уся беларуская інтэлігенцыя. Гэта ўкладалася ў агульнае рэчышча сталінскага тэрору, ці за гэтым хавалася нешта большае?**

—Гэта быў генацыд. Была сытуацыя, калі ў 1939-м з 700 літаратараў на волі засталося ўсяго 7. У нас адабралі гісторыю і яе герояў, нацыянальныя сымбалі, зьнішчылі амаль усю эліту. Вынішчалі людзей, якія змагаліся за беларускі правапіс...

**— Маштаб тых злачынстваў дасёньня фальсыфікуецца.**

—У 1995 г. у энцыкляпэдычным даведніку «Беларусь» у артыкуле пра Курапаты адзначалася, што там НКВД у 1930-я расстрэльвала бязьвінных жыхароў Беларусі. Падавалася і лічба ахвяраў, якая, паводле дадзеных яшчэ савецкай урадавай камісіі, складала ад 30 да 100 тысячаў. Праз дзесяць гадоў выйшаў адпаведны том «Беларускай энцыкляпэдыі». Разгарнуў яго і чытаю, што ў Курапатах расстрэльвалі ці то фашысты, ці то НКВД. І ні слова пра колькасьць ахвяраў. У той самай энцыкляпэдыі 1995 г. ёсьць інфармацыя пра Слуцкае паўстаньне й цытата з рэзалюцыі зьезду Случчыны, які абвяшчалася часткаю БНР. Тамсама быў засьведчаны намер арганізаваць збройны чын у абарону незалежнасьці. У пазьнейшай энцыкляпэдыі артыкул пра Слуцкае паўстаньне старанна адрэдагаваны.

**— Сучасная Беларусь таксама мае праблемы з нацыянальнымі героямі. На банкнотах няма постацяў. На пачатку 1990-х там былі зайцы, рысі ды іншыя зьвяры, цяпер — будынкі. Немагчыма знайсьці колькі постацяў, зь якімі б сябе ідэнтыфікавалі і грамадзтва, і ўлады?**

— Былы кіраўнік Нацыянальнага Банку Станіслаў Багданкевіч сьцьвярджае, што валюта з выявамі Эўфрасіньні Полацкай і іншых нашых нацыянальных герояў была надрукаваная. Гэтыя грошы недзе на складох чакаюць лепшых часоў…

**Гутарылі Анджэй Бжазецкі і Малгажата Ноцунь, журналісты польскай газэты «Тыгоднік паўшэхны»**



СЯРГЕЙ ХАРЭЎСКІ

**Савецкая гісторыя Беларусі пачыналася ад 1917 году.**

# Жыцьцё і сьмерць Паўла Марозава

Мала хто ведае, што хлопчык, які загінуў 75 гадоў таму, быў беларускамоўны. Піша **Вацлаў Шаблінскі.**

3 верасьня 1932 г. ля ўральскай вёскі Герасімаўка, заснаванай перасяленцамі зь Беларусі, былі жорстка забітыя два мясцовыя хлапчукі. Гэтая крывавая гісторыя даўно б забылася, калі б аднаго з забітых ня звалі Паўлік Марозаў.

І сёньня бацькі называюць «паўлікамі марозавымі» празьмерна цікаўных нашчадкаў. Гэта імя ўсё яшчэ носяць некаторыя вуліцы былых савецкіх гарадоў, школы, дзіцячыя лягеры.

Кім быў Палік Марозаў? Што зрабіў? Чаму быў узьнесены прапагандай?

## Нараджэньне легенды

Міт пра Паўліка ўзьнік хутка. Ад часу пагібелі хлопчыка не пасьпеў прайсьці год, як з друку выйшлі кніжкі Паўла Саламеіна "Ў кулацкім гнязьдзе» і Віталя Губарава «Адзін з адзінаццаці». (Пазьней выходзілі пад назвамі «Паўка-камуніст» і «Паўлік Марозаў»). Яны склалі афіцыйны канон марозаўскай легенды. Вось яе кароткі зьмест: Паўлік вельмі рана стаў прыхільнікам новай улады і ўзначаліў піянэрскі атрад у сваёй вёсцы. Калі хлапчуку стала вядома, што ягоны бацька, старшыня сельсавету, дапамагае сасланым кулакам, ён выдаў бацьку органам, і выступіў на судзе. Потым Паўлік працягвае барацьбу з тымі, хто ня хоча здаваць хлеб дзяржаве. Піянэра і яго маленькага брата забіваюць родны дзед і стрыечны брат Даніла. Савецкі суд карае забойцаў.

Пра Паўліка сьпявалі песьні, ставілі спэктаклі і опэры. Называлі яго імем піянэрскія атрады і караблі.

## Беларускія паўлікі

Вобраз дзіцяці-даносчыка існаваў у савецкім мастацтве і да Паўліка, і пасьля. Так, Андрэй Александровіч напісаў верш пра піянэра Грышку, які паведамляе ў сельсавет, «што ягоны родны тата не плаціў даўно падатак... і заўсёды глядзеў гадам на савецкую ўладу». Творам на сюжэт пра Паўліка Марозава называюць аповесьць Алеся Якімовіча «Перамога», якая выйшла таксама ў 1932 г. Калізія — дачка супраць бацькі-ворага савецкай улады — пакладзена ў аснову драмы Эдуарда Самуйлёнка «Пагібель воўка». Ня трэба думаць, што гэта ўсё было чыстай фантазіяй.

Чаму ж гісторыі пра Паўліка пашанцавала больш, чым іншым такім аповядам? Для мэтаў прапаганды найбольш падыходзіў сюжэт з трагічным канцом. Забойства малых дзяцей родным дзедам рабіла моцнае ўражаньне, асабліва на дзіцячыя пачуцьці. Важным было і тое, што бацька Паўліка быў ня простым ворагам, а замаскіраваным, які адначасова і працаваў супраць савецкай улады і ўвасабляў яе ў вёсцы. Менавіта такіх ворагаў і трэба было, на думку таварыша Сталіна, шукаць і выкрываць у першую чаргу.



**Паўлік Марозаў (зьверху у цэнтры). Зьлева ад яго — стрыечнік Даніла, меркаваны забойца. Фота зробленае за два гады да трагедыі.**

Паўлікам вельмі хутка «завалодала» і антыкамуністычная прапаганда. Яго гісторыя расказвалася ў амэрыканскім падручніку «Камунізм», як прыклад таго, што камуністычная мараль адрозьніваецца ад агульначалавечай. Пісьменьнік-эмігрант Кастусь Акула пісаў: «Каму стаіць помнік у Маскве? Паўліку Марозаву, які на бацькоў паклёпнічаў».

## Марозаў — беларус

У другой палове восемдзясятых зьявілася кніга дысыдэнта Юрыя Дружнікава «Даносчык 001, або ўзьнясеньне Паўліка Марозава». Паводле вэрсіі Дружнікава, хлопчык зусім ня быў піянэрам, данесьці на бацьку яго падгаварыла маці, пакрыўджаная на мужаву здраду. Адказнасьць за сьмерць Паўла і ягонага брата Федзі Дружнікаў усклаў на чэкістаў, якія былі зацікаўленыя ў гучнай кампаніі супраць кулакоў. Кніга мела вялікі рэзананс. Для адказу сабраўся савет усесаюзнай піянэрскай арганізацыі. Але савецкім установам ужо ня верылі. У жніўні 1991 г. разам з жалезным Феліксам паляцеў і помнік Марозаву. Камуністы пачалі крычаць, што юнага піянэра забіваюць зноў. Пры гэтым усіх мала цікавіла, што ж адбылося на самай справе.

Пачатак драмы сям'і Марозавых узыходзіць да пачатку XX ст., калі тысячы беларусаў, заахвочаных расейскімі ўладамі (памятаеце прыстава з «Сну на кургане»: «У Сібір на перасяленьне», рушылі на асваеньне незанятых земляў. Сярод іх была і група сялянаў зь Віцебшчыны, якая дабралася да сёньняшняга Таўдзінскага раёну Сьвярдлоўскай вобласьці, і заснавала вёску Герасімаўка. Каляністы захавалі сваю мову. Беларуская гаворка герасімаўцаў прыводзіцца ў кнізе Саламеіна «Паўка-камуніст». Пра беларускае паходжаньне Марозавых можна знайсьці амаль ва ўсіх кнігах пра Паўліка, але прапаганда гэта ня згадвала. Усесаюзны герой павінен быў быць «старэйшым братам».

## Бацька родны і бацька хрышчоны

Сярод пасяленцаў вылучаўся моцны гаспадар Сяргей Марозаў. У мінулым «дзед Сярога» быў жандармам. Гэта не перашкодзіла яго сынам Трафіму ды Івану, бацьку Данілы — аднаго з забойцаў Паўліка, адным зь першых у Герасімаўцы перайсьці на бок саветаў і запісацца ў Чырвоную Армію. Асабліва вызначыўся Трафім, якога сем разоў ранілі. Таму, калі ў 1930 г. было вырашана зрабіць у вёсцы сельсавет, менавіта Трафіма праводзяць у старшыні. Трафім быў жанаты і меў разам з жонкай Тацянай пяць сыноў, старэйшым зь якіх быў адзінаццацігадовы Паўлік. Неўзабаве Трафім разводзіцца, каб ажаніцца з маладзенькай. У гэтым яго напэўна падтрымаў бацька, які не любіў першую нявестку.

Па тагачасных мерках Трафім быў пасьпяховым адміністратарам. Пры ім у вёсцы пачала працаваць школа, зьявіўся і піянэрскі атрад. Начальства было задаволенае дзейнасьцю старшыні і тройчы перазацьвярджала яго на пасадзе.

Узьнікае пытаньне пра прычыну заканчэньня пасьпяховай кар'еры Марозава-старэйшага? Якую ролю тут адыграў сын? І што ці хто прымусіў хлопчыка выступіць супраць бацькі? Дружнікаў лічыць, што маці, якая помсьціла мужу за

развод. Але у кнізе Губарава «Паўлік Марозаў» маці гаворыць пра арыштаванага мужа: «Кахала ж яго. Здавалася, лепш за яго няма.»

Марозава не губляла надзеі вярнуць мужыка і не хацела ягонага арышту. У пошуках адказу на пастаўленыя пытаньні мы зьвярнулі ўвагу яшчэ на аднаго персанажа гэтай гісторыі — хроснага і дзядзьку Паўліка Арсена Кулуканава. Згодна з афіцыйнай вэрсіяй, менавіта ён заплаціў золатам за забойства Паўліка і Федзі. У савецкіх кніжках Кулуканаў характарызуецца як самы багаты кулак і галоўны контрарэвалюцыянэр у вёсцы. Аднак некаторыя факты наводзяць на думку, што дзядзька Арсен быў хутчэй на баку хрэсьніка, а не старэйшых Марозавых. На судзе Кулуканаў заяўляе літаральна, што любіў Паўліка. Да таго ж грошы, якія Кулуканаў быццам бы абяцаў за забойства, як прызнаў Даніла Марозаў, на чыіх сьведчаньнях і будаваліся абвінавачваньні, забойцы так і не атрымалі. Няўжо не папрасілі авансу ?

Адной з галоўных цяжкасьцяў пры рэканструкцыі падзеяў зьяўляецца адсутнасьць дакладнага тэксту паўлікавых паказаньняў. Існуе каля трыццаці варыянтаў тэксту прамовы, якую быццам бы сказаў хлопчык супраць бацькі. Прывядзем адзін з варыянтаў: «Дзядзечкі! Мой бацька рабіў яўную контрарэвалюцыю.... і яшчэ хачу сказаць, што мой бацька прысабечвае кулацкую маёмасьць, нядаўна ўзяў ложак у кулака Кулуканава і хацеў узяць стог сена». Чым цікавы гэты тэкст? Найперш, ён рэзка супярэчыць афіцыйнай вэрсіі, што Трафім Марозаў — абаронца кулакоў, і ў прыватнасьці, Кулуканава. Атрымоўваецца, што Паўлік выступіў супраць роднага бацькі дзеля хрышчонага.Такое быць магло. Калі праўда, што ні бацька, ні дзед не дапамагалі Паўліку, яго братам і маці, і першым, да каго мог зьвярнуцца хлопчык, быў хрышчоны. Паўліка і дзядзьку магла аб'ядноўваць нелюбоў да сквапнага старшыні, які ў сваёй чэрствасьці не шкадаваў і родных . Ці не хрышчоны падбіў Паўла выступіць супраць бацькі? Ці не таму Марозавы літаральна топяць на судзе Кулуканава?

Усё гэта толькі вэрсія. Аб'ектыўная ацэнка будзе магчымаю, толькі калі будуць надрукаваныя сапраўдныя паказаньні Паўліка і іншыя матэрыялы па справе Трафіма Марозава. Напэўна можна сьцьвярджаць толькі адно, Трафім быў асуджаны на 10 гадоў зьняволеньня і больш не вярнуўся ў вёску. Ня трэба сьпяшацца мяняць у гісторыі Марозавых плюсы на мінусы. Калі Трафім сапраўды дапамагаў раскулачаным, то рабіў гэта не па закліку сэрца, а за грошы.

## У піянэры — дзеля гаспадаркі

Дакумэнты пра сакрэтную дзейнасьць старшыні трапілі ў органы хутчэй за ўсё без удзелу Паўліка, і хлопчык толькі пацьвердзіў ужо вядомае. Абурае, безумоўна, калі сын выступае супраць бацькі, але ня варта забываць, што Трафім першым разарваў родныя сувязі, пакінуўшы сям'ю без дапамогі.

Прынята лічыць, што Паўліка забілі за паказаньні супраць бацькі. Але паміж судом над Трафімам і забойствам прайшло паўгоду. Значыцца, паказаньні, прынамсі, не адзіная прычына.

Савецкая літаратура рамантызавала загінулага піянэра, малявала яго вундэркіндам, абаронцам справядлівасьці, узорам сумленнасьці. Пазьней Паўліка пачалі называць «хуліганам» і «ідыётам». Сьцвярджалі, што ён так і не вывучыўся чытаць, як доказ недаразьвітасьці прыводзілі і ягоную беларускую гаворку. Паўлік наўрад ці адставаў у разьвіцьці ад сваіх вясковых аднагодкаў. Пасьля сыходу бацькі менавіта Паўлік павінен быў стаць на чале гаспадаркі і клапаціцца пра маці і братоў.

Такое жыцьцё павінна было навучыць, што і « родзічы па крыві могуць быць ворагамі» (М. Горкі). А значыць, спадзявацца трэба толькі на сябе і трымацца моцнага. Самай моцнай на той час была савецкая ўлада. Уступленьне ў піянэры было для Паўла натуральным, бо давала падставы разьлічваць на ўладу.

Улада запатрабавала дапамогі ў адказ. Зь іншымі піянэрамі Паўлік расклейваў пагрозы-папярэджаньні тым, хто не хацеў плаціць вялікія падаткі, здаваць хлеб дзяржаве. Абавязковай умовай уступленьня ў піянэры лічылася адрачэньне ад Бога, і, паводле сьведчаньняў, Паўлік быў першым бязбожнікам у вёсцы. Гэта не магло ня выклікаць варожага стаўленьня.

## Спрэчка за бацькаўшчыну

Але чаму забілі Федзю, які на бацьку не даносіў, піянэрам ня быў, у Бога верыў (маці паставіла на магіле малодшага сына крыж)?

Магчыма, браты Марозавы сталі ахвярай канфлікту, які ўзьнік яшчэ да іхнага нараджэньня. Калі іх бацькі толькі ажаніліся, Тацяна дамагалася, каб муж аддзяліўся, узяўшы частку бацькавага надзелу. Пасьля арышту Трафіма дзед Марозаў хацеў вярнуць сваю зямлю, супраць чаго былі Тацяна і Паўлік. Для абодвух бакоў пытаньне было зьвязана з праблемай выжываньня. Калгасу ў Герасімаўцы яшчэ не было і «ўлада зямлі» была ў сіле .

На баку дзеда быў старэйшы ўнук, дзевятнаццацігадовы Даніла, сын дзядзькі Паўліка Івана. Даніла не хаваў варожасьці да стрыечнага брата і, калі Паўліка і Федзю знайшлі мёртвымі, вяскоўцы паказалі менавіта на Данілу. Даніла «раскалоўся»: саўдзельнікамі ён назваў дзеда, бабку, Кулуканава, і роднага бацьку Івана. Усе яны былі асуджаныя на сьмерць.

Ці справядлівы быў прысуд? На целе забітых знайшлі сьляды барацьбы. Значыць, забойца быў не нашмат мацнейшы за свае ахвяры і хутчэй за ўсё дзейнічаў адзін. Гэта ізноў выводзіць на Данілу. Свае меркаваньні наконт Кулуканава мы ўжо выказвалі. Марозавы-старэйшыя не любілі Паўліка, але ці настолькі, каб прыняць удзел у забойстве ўнукаў? Выказваліся гіпотэзы пра чэкісцкі сьлед, пра помсту раскулачаных, якім Трафім выдаваў даведкі.

## Жывыя атрыбуты

Сьмерць зрабіла з Паўліка «сьвятога пакутніка» піянэрскага руху, вечнага аднагодка ўсіх піянэраў. Тацяна Марозава стала жывым атрыбутам сынавага культу. Апошнія гады правяла каля Артэку, расказваючы піянэрам пра сына. Яна памерла на пачатку васьмідзясятых. Але наўрад ці яе жыцьцё было шчасьлівым. Малодшы сын Раман загінуў на вайне. Сярэдняму Аляксею давялося прайсьці ГУЛаг. На службе ў войску страціў здароўе ўнук Паўлік.

Паўліка цяпер найбольш памятаюць у Герасімаўцы. Часы марозаўскага культу для герасімаўцаў — «залатая пара». «Быў Пашка добры, і мы патрэбныя былі», — кажуць яны. Каля дзесяці гадоў таму праваабарончае таварыства «Мэмарыял» зьвярнулася з хадайніцтвам па рэабілітацыі сялянаў: Сяргея, Ксеніі, Данілы Марозавых і Кулуканава Арсенія з-за недаказанасьці віны. Генпракуратура Расейскай Фэдэрацыі пакінула ранейшы прысуд у сіле, прызнаўшы марозаўскую справу выключна крымінальнай і пад дзеяньне закона «аб рэабілітацыі ахвяраў палітычных рэпрэсіяў» не падпадаючай.

**P.S.**

Гісторыя Паўліка перапісвалася і перапісваецца шмат разоў. Зразумець, што праўда, а што прыдумка — няпроста. Я адабраў тое, у чым сыходзяцца розныя крыніцы. Паўлік для мяне не ідэалягічны ідэал, а рэальны хлопчык з трагічным лёсам, і я ня бачу патрэбы рабіць страшную рэчаіснасьць яшчэ больш чорнай. Калі ў каго ёсьць заўвагі: «няхай мяне направяць».

**Вацлаў Шаблінскі**

# Дзяніс Раманюк: Бацькава выхаваньне

Пра Міхася Раманюка зь яго сынам Дзянісам гутарыць **Зьміцер Панкавец**.

4 верасьня споўнілася 10 гадоў з дня сьмерці этнографа Міхася Раманюка. Мы гутарым з сынам Міхася Дзянісам Раманюком у той самай колішняй бацькавай майстэрні на вуліцы Максіма Танка. Здаецца, што гэта ідэальнае месца для гутаркі, бо сьцены і паліцы майстэрні застаўленыя і завешаныя шматлікімі карцінамі, збанамі, іконкамі, саламянымі вырабамі і г.д. Дзяніс кажа, што тут практычна нічога не зьмянілася ад сьмерці бацькі.

**Дзяніс Раманюк**: Нават ня верыцца, што мінула ўжо дзесяць гадоў з таго часу, як памёр мой бацька Міхась Раманюк. Дзякуй Богу, за гэты час удалося выдаць дзьве ягоныя кніжкі «Беларускія народныя крыжы» і «Беларускія народныя строі». Спадзяюся, што за наступнае дзесяцігодзьдзе будзе хаця б адна ці нават дзьве кнігі. Шмат хто яго па сёньня памятае, шмат хто распавядае пра яго мне пры выпадковых сустрэчах. Ягонае імя працягвае жыць, хаця лепш было б, каб жыў ён сам. Гэта быў добры, жыцьцярадасны, упэўнены і вясёлы чалавек.

**«Наша Ніва»: Дзесяць гадоў з дня сьмерці дастатковая дата, каб годна ацаніць усё тое, што зрабіў Міхась Раманюк?**

**ДзР**: Гэты ўклад быў ацэнены раней. Калі не пры ягоным жыцьці, то дакладна ў першыя гады пасьля сьмерці. Гэты чалавек стаў сапраўдным клясыкам беларускай культуры: ён зрабіў рэгіянаваньне адзеньня, клясыфікаваў беларускія крыжы і ўсё, што зь імі зьвязана. Зрабіў мастацка-графічную рэканструкцыю народных строяў, паводле якіх сёньня многія працуюць. Я часта пазнаю ў творах беларускіх мастакоў здымкі Міхася Раманюка. Тое, што зрабіў ён, натхніла сотні творцаў.

## Сабраў усё сваімі нагамі

**«НН»: Міхась Раманюк браўся за працы, ведаючы, што пры СССР яны ня маюць шанцаў быць выдадзенымі, як крыжы. Чаму?**

**ДзР**: Ён рабіў гэта, бо было цікава, бо гэта быў сэнс ягонага жыцьця. Тое, што працягваю рабіць я, тая ж Чарнобыльская тэма, нават пра яе многія кажуць, што гэта нікому не патрэбна і круцяць пальцам каля скроні. Так было і з бацькам. Дзякуючы стараньням такіх фанатаў, як Міхась Раманюк, яшчэ і захаваная аўтэнтычная беларуская культура.

**«НН»: Вы часта езьдзілі з бацькам у экспэдыцыі?**

**ДзР**: Так. Штогод па некалькі разоў. Пачаў езьдзіць тады, калі яшчэ хадзіў у дзіцячы садок. Цяжка ўзгадаць нейкую адну паездку. Кожная экспэдыцыя гэта новы рэгіён, іншая вёска, іншы прадмет дасьледаваньня. Міхась Раманюк меў надзвычайны талент шукаць нейкія рэчы і размаўляць зь людзьмі. Звычайна экспэдыцыі праходзілі паводле наступнага сцэнару: куплялася ежа, стужкі, браліся неабходныя рэчы, гара торбаў. Браліся квіткі на транспарт, бо машыны ў бацькі не было, ён сабраў усё сваімі нагамі, толькі часам ён езьдзіў аўтобусам з музэем, ці на аўтамабілі вазілі ягоныя сябры. Ехалі зь дзьвюма ці трыма перасадкамі, нейкімі папуткамі, пасьля ішлі пешшу ў тыя вёскі, якія былі заплянаваныя. Ужо ў вёсках пачыналіся размовы зь людзьмі, бацька намацваў глебу, дзе можна што знайсьці, выцягваў патрэбную інфармацыю. Мы ішлі па хатах, нам паказвалі патрэбныя рэчы. Усё вартае і цікавае фатаграфавалі. Калі размова ішла пра адзеньне, то адразу шукалася патрэбная бабка, якую мы рознымі ўгаворамі прасілі апрануць гэты строй. Нешта супэркаштоўнае па магчымасьці куплялася ці нам проста дарылі гэтыя рэчы. Калі было неабходна, то ехалі ў наступную вёску, адтуль у трэцюю і г.д. Мінімальная экспэдыцыя была два дні, максымальныя — тыдзень ці нават дзесяць дзён. Усе стужкі, апаратура, квіткі набываліся за свой кошт.

**Міхась Раманюк**

(1944—1997). Нар. у Кавалях Брагінскага раёну. Мастацтвазнаўца, этнограф, мастак. Дасьледаваў пытаньні народнага мастацтва і матэрыяльнай культуры Беларусі. Зрабіў мастацтвазнаўча–этнаграфічнае раянаваньне беларускага народнага адзеньня XIX—п.XX ст., каля 100 рэканструкцыяў беларускіх строяў. Сабраная ім калекцыя народнага адзеньня экспанавалася ў Менску, Паражы і Ліёне.



**Міхась Раманюк з сынам Дзянісам у экспэдыцыі. Вёска Хатынічы, Ганцавіцкі раён, 1989 г.**


На здымках Міхася Раманюка — клясычная народная прыгажосьць.

**«НН»: Бацька заўсёды браў Вас з сабой?**

**ДР**: Я для бацькі ў экспэдыцыях заўсёды быў праблемай, хоць ён мяне заўжды ў іх браў. Я часам адмаўляўся, але калі згаджаўся, то бацька быў страшэнна рады. Калі ён мог цэлы дзень ня есьці, то я, малы, так ня мог. Са мной нярэдка здараліся розныя сьмешныя рэчы, то я зь вясковымі хлопцамі ўлезу ў ледзяную ваду, а пасьля ў мяне ангіна з тэмпэратурай, ці я наемся нямытых яблыкаў, і ў мяне ўжо іншыя праблемы, ці недзе палезу секчы дровы і адаб'ю палец. Аднойчы спалі на сене, і я праваліўся ў хлеў да сьвіней. Бацька браў у экспэдыцыі і сястру, гэта было ягонае выхаваньне.

**«НН»: Кантактаваць зь людзьмі было лёгка?**

**ДзР**: Міхась Раманюк уключаў у размовах зь вяскоўцамі ўсё сваё абаяньне, ведаў нюансы мовы таго ці іншага рэгіёну. Бацька ўмеў правільна задаваць пытаньні. Я пераканаўся на сваім досьведзе, што любое няправільна зададзенае пытаньне, можа спалохаць людзей і ад іх пасьля цяжка дабіцца толку. Вельмі важным быў вечар, бо мы ішлі, як правіла, да самай цікавай, гаваркой і дасьведчанай жанчыны ў вёсцы і прасіліся да яе пераначаваць. У такіх выпадках бацька сядзеў да позьняй ночы з гэтай бабуляй і старанна запісваў усе ейныя аповеды ў свой нататнік.

## Урбанізацыя скрозь

**«НН»: Дзякуючы знаходкам Міхася Раманюка, сёньня магчыма адрадзіць аўтэнтычную беларускую культуру?**

**ДзР**: Мы якраз гэтым і займаемся. Дзеля гэтага і працуем. Нічога ня зробіш, але беларуская аўтэнтычная культура знаходзіцца на мяжы зьнікненьня. Гэта здарылася ня ўчора і ня летась. Гэта здарылася яшчэ да сьмерці Міхася Раманюка. Беларускай аўтэнтыкі застаецца вельмі мала. Сёньняшнія гарадзкія дасьледчыкі спрабуюць апісаць тое, чаго ўжо няма. Яны езьдзяць фіксаваць нейкія абрады, але ж яны даўно ўжо не народныя, а псэўданародныя. Яны падтрымліваюцца сельскімі клюбамі, выканкамамі, гэта ўсё штучнае, ў гэтым няма духоўнай патрэбы.

**«НН»: Чым адрозьнівалася экспэдыцыя дваццаць гадоў таму і сёньняшняя?**

**ДзР**: Дваццаць гадоў таму мы маглі зайсьці ў любую хату і знайсьці там фартух, кашулю, дыван, куфар, збан, абраз, лыжку, кошык. Цяпер жа мы можам знайсьці нешта з гэтага ці на гарышчы, як выключны выпадак, ці ручнік пад нагамі. Сучасная ўрбаністычная культура ўсё замяняе. Беларусы становяцца больш лянотнымі. Раней людзі не маглі нічога купіць і былі вымушаныя рабіць усё самі, цяпер можна пайсьці ў краму. Беларусы рабілі гэта штодня, нехта ткаў, нехта плёў кошык, круцілі збан. Усё гэта разьвівалася і ўдасканальвалася, каб зрабіць прыгажэй. Каму цяпер трэба той жбан, калі ёсьць шматфункцыянальная плястыкавая бутэлька? Адбыўся натуральны працэс урбанізацыі.

## Макавей зь неба

**«НН»: Ці засталіся ў Беларусі яшчэ нейкія архаічныя абрады?**

**ДзР**: З кожным годам іх становіцца ўсё менш і менш.

**«НН»: Можаце расказаць пра сваю апошнюю знаходку?**

**ДзР**: Знайсьці новы абрад сёньня ўжо немагчыма. Размова ідзе аб апісаньні і фатаграфаваньні тых абрадаў, якія ўжо былі зафіксаваныя раней. 14 жніўня я прыехаў з экспэдыцыі зь Веткаўскага раёну, зь сьвяткаваньня Макавея. Гэта быў абрад наведваньня сьвятых крыніцаў. Летась я туды езьдзіў, але ніхто на крыніцы не пайшоў, бо нехта памёр у вёсцы. Сёлета пайшлі толькі тры бабулькі, налета, баюся, ня пойдзе ўжо ніхто. Гэтыя тры бабулькі зь цяжкасьцю знайшлі крыніцу, яна была кілямэтры за два ад вёскі ў полі. Стаіць агароджаная крыніца, з крыжом, з абразом, б'е вада. Жанчынкі прынесьлі з сабой плады (мак, моркву, яблыкі, кветкі), паклалі іх на ручнікі перад крыніцай. Галоўная зь іх узяла малітоўнік, яны сталі насупраць крыжа, прачыталі малітву, адна з бабулек акрапіла мак і іншае прынесенае з сабой, акрапіла другіх бабулек, мяне. Пасьля ўзялі кубачак вады, папілі, абмылі твары, набралі пляшкі вады. Зрабілі рытуальны стол, троху перакусілі. Гэта было сапраўды па-сьвяточнаму і інтрыгуюча. Каб гэта было магчыма сфатаграфаваць зь неба, то было б проста фантастычнае відовішча.

**«НН»: Архаічныя беларускія традыцыі захаваліся толькі на Гомельшчыне?**

**ДзР**: У асноўным гэта гомельскае Палесьсе, але і берасьцейскае. А таксама частка Магілёўшчыны. У Заходняй Беларусі больш моцныя каталіцкія традыцыі, там зь вялікім фанатызмам кожны вечар зьбіраюцца ля вясковых крыжоў. Ва Ўсходняй Беларусі гэта хутчэй паганска-хрысьціянскія традыцыі.

## Хобі і сэнс жыцьця

**«НН»: Калі зьявілася адчуваньне, што Вы працягнеце бацькавую справу?**

**ДзР**: Калі бацькі ня стала. Я рабіў альбом «Беларускія народныя крыжы». Атрымалася, што я рабіў яго ня проста як мастак, а як укладальнік кнігі. Гэта былі мае

Працяг на старонцы 26.

# Дзяніс Раманюк: Бацькава выхаваньне

Працяг са старонкі 25.

першыя самастойныя экспэдыцыі. Я зразумеў, як цяжка даецца кожная старонка кнігі. Колькі трэба аддаць свайго часу, грошай, сілаў. Я асэнсаваў усю значнасьць той працы, якую рабіў бацька.

**«НН»: Дык а дзеля чаго ўвогуле гэта рабіў Ваш бацька, цяпер Вы?**

**ДзР**: Дзеля Бацькаўшчыны... Увогуле гэта досыць патаснае пытаньне. Гэта не раскажаш ніякімі словамі. Банальна, гэта можна назваць хобі. Можна сказаць — сэнс жыцьця. Гэты працэс прыносіць і задавальненьне, і цікавасьць, і вынікі. Як нехта круціць гайкі, так мы з бацькам робім гэта.

**«НН»: Адразу пасьля выбуху Чарнобылю Міхась Раманюк паехаў на Брагіншчыну. Ён працягваў езьдзіць па забруджаных тэрыторыях да самай сьмерці. Ці ня гэта падарвала ягонае здароўе?**

**ДзР**: Апошняя ягоная вандроўка таксама была на Гомельшчыну, здаецца, у Чачэрскі раён, за некалькі тыдняў да таго, як яго паклалі ў рэанімацыю. Ягоная вёска на Брагіншчыне аказалася за дротам, туды не пускалі нікога. Ня ведаючы пра Чарнобыль, мы працягвалі езьдзіць па заражаных тэрыторыях. У 1988 г. у экспэдыцыі ў Чэрыкаўскім раёне мы знайшлі вялікі абракальны крыж на прошчах каля вёскі Малінаўка, які ад вялікай колькасьці ручнікоў ператварыўся ў нейкі своеасаблівы стог. Я быў на тым самым месцы ўжо пасьля сьмерці бацькі, але не знайшоў крыжа. Бо ўсе гэтыя вёскі закапаныя, узровень радыяцыі там ня меншы, чым у трыццацікіляметровай зоне. Тады не было ніякіх дарог, была жахлівая сьпякота, з-пад колаў валіў вялізны пыл. І вось мы з далечыні ўбачылі гэты крыж. Мы загрузьлі ў пяску, адкопвалі машыну. Дыхалі радыяцыйным паветрам. Толькі працуючы над альбомам «Чарнобыль» я ўсё гэта зразумеў і пераасэнсаваў.

Нельга казаць, што толькі Чарнобыль падарваў здароўе бацькі. Найхутчэй, гэта адзін з многіх фактараў. Можна сказаць, што ён згарэў не ў Чарнобыльскай радыяцыі, а ў сваёй працы. Ён працаваў дзень і ноч, бо хацеў пасьпець усё зафіксаваць, вывучыць і ўбачыць. Адпачынкі зь сям'ёй для яго былі выключэньнямі. Я магу па пальцах пералічыць усе зь іх, бо гэта было сапраўдным сьвятам.



РЫМАНТАС ДЗІХАВІЧУС

Дзяніс Раманюк у бацькавай майстэрні.

## Сэнсацыі ў шуфлядах

**«НН»: Ці ўсе працы Міхася Раманюка ўжо выдадзеныя?**

**ДзР**: Большая частка ягоных працаў яшчэ ляжыць у шуфлядах. Ляжыць рукапіс новай кнігі па беларускім нацыянальным адзеньні — гэта сотні старонак, дзе расьпісана абсалютна ўсё, дзе, у якім рэгіёне, што насілася — ад фартуха да галаўнога ўбору. Гэта будзе кніга вялізнага аб'ёму, туды трэба будзе зьмясьціць тысячы фатаздымкаў, шмат зь якіх яшчэ нідзе не друкаваліся. У эстонцаў і латышоў, напрыклад, такія працы ўкладзеныя ў шыкоўныя трохтомнікі. Я хачу ўключыць сюды нават выкрайку тых строяў, каб кожны ахвотны мог яго зрабіць. На гэта трэба шалёныя грошы. На дапамогу дзяржавы даўно ўжо не разьлічваю, бо пераканаўся, што гэта пустое. Калі яны дадуць грошай, то паставяць такія ўмовы, што будзе немагчыма працаваць. Ляжыць рукапіс беларускіх куфроў, а таксама дываноў.

**«НН»: Апроч выездаў у экспэдыцыі, у Міхася Раманюка была і асноўная праца выкладчыка ў Акадэміі мастацтваў.**

**ДзР**: Ягонымі вучнямі былі Валеры Янушкевіч, Алесь Драніца, аўтар помніку Скарыну перад Нацыянальнай бібліятэкай, прарэктар Акадэміі мастацтваў Міхал Баразна, Андрэй Задорын. Ён быў адным зь першых адкрывальнікаў беларускага прымітывізму. Бацька шмат выкладаў, паўсюль, куды яго запрашалі.

**«НН»: Адкрыць музэй Міхася Раманюка няма жаданьня?**

**ДзР**: Былі такія думкі. Была нават спроба адкрыць ягоны музэй пры Ўнівэрсытэце культуры. Усё ўпіраецца ў грошы. Калі рабіць музэй, то трэба рабіць добры музэй, а не фармальны.

# «І згаджаліся мільёны стаць стукачамі»

Гісторыка–дакумэнтальны нарыс **Віктара Лютынскага, угрунтаваны на дакумэнтах з архіваў ГПУ.**

Усім нам, а асабліва тым, хто цяпер займаецца лякіраваньнем савецкага мінулага, было б карысна азнаёміцца з адным з самых гнюсных і ганебных праяваў тае эпохі— стукацтвам.

Вялікі знаўца камуністычнага рэжыму ў СССР Аляксандар Салжаніцын у «Архіпэлягу ГУЛАГу» пісаў, што «з чатырох-пяці гарадзкіх жыхароў аднаму хоць аднойчы ў жыцьці ды прапаноўвалі стаць стукачом. Калі перасед-зела на архіпэлягу за 35 гадоў (да 1953 г.) мільёнаў сорак, дык хаця б па кожнай трэцяй, няхай пятай справе ёсьць чыйсьці данос і хтосьці сьведчыў. Яны й сёньня сярод нас, гэтыя чарнільныя забойцы. Адныя саджалі блізкіх праз страх — і гэта яшчэ першая ступень, іншыя з карысьці, а трэція — самыя маладыя тады — здраднічалі натхнёна, здраднічалі ідэйна, часам нават адкрыта, бо лічылася клясавай доблесьцю выкрыць ворага…».

Васіль Быкаў, які таксама шмат разважаў над фэномэнам здрадніцтва, у тым ліку і стукацтва, у кнізе ўспамінаў «Доўгая дарога дадому» пісаў, што «ў 20-я гады ў СССР было 10 млн сексотаў, пра гэта сьведчыў сын Г.Малянкова, ужо ён штосьці ведаў. Дый сам Хрушчоў, выкрываючы Берыю, сказаў, што ў СССР кожны пяты — сексот... То згуртаваны і разгалінаваны сакрэтны клан, які пераўзыходзіць усе вядомыя ў гісторыі кланы, у тым ліку і масонскі. Калгасьнік з паляводчай брыгады, такі ж сексот зь мянушкай, як і міністар або прафэсар, і змушаны аднолькава верна служыць свайму куму, якому падпарадкаваны да сьмерці».

## Стукалі і жук, і жаба

Працуючы з дакумэнтамі Аршанскага райкаму КП(б)Б, якія захоўваюцца ў Дзяржархіве Віцебскай вобласьці, трапіў на «Працоўныя зводкі ГПУ» — абагульненьні данясеньняў сакрэтных супрацоўнікаў, датаваныя 1932—33 гадамі.

Накіроўваліся яны пад грыфам «зусім сакрэтна» ў шасьці асобніках розным органам кіраваньня, у тым ліку ў Аршанскі райкам КП(б)Б. Таму і апынуліся ў партархіве, на жаль, не за ўвесь пэрыяд, бо зь іх вымалёўваецца зусім неглянцаваная карціна жыцьця тагачаснага савецкага грамадзтва.

Прааналізуем склад сексотаў. Яны засакрэчаныя пад мянушкамі. Усяго ў памагатых органам значылася на той час каля ста чалавек. У 1932 г. у Воршы было 32 тыс. жыхароў, дык адзін сексот прыходзіўся ў сярэднім на 300 зь нечым чалавек. Быццам і няшмат, але ж трэба памятаць, што потым колькасьць іх бязьмерна ўзрасьце, бо самыя страшэнныя гады сталінізму яшчэ наперадзе.

Прозьвішчы агентаў ГПУ мы, зразумела ж, не даведаемся. Затое ў выбары мянушак фантазія гэпэушнікаў ды іх памагатых была невычарпальнай. Некаторыя сексоты атрымалі мянушкі, відаць, з-за асаблівасьцяў фізычнай канструкцыі. Ёсьць тут «Карлік» (гэта мог быць і бамбіза), «Кульгавы», «Калечаны». Адрозьніваліся й па колеры: «Цёмны», «Белы», «Буры», «Красны». Пашыранымі былі й назвы, пазычаныя з жывёльнага ды расьліннага сьвету: «Галка», «Кот», «Заяц», «Ліса», «Жук», «Павук» (у адным даносе ён абвінавадціў у розных правапарушэньнях ажно 15 жыхароў Копысі), «Лось», «Дуб», «Радыс», «Елка» і г. д.

Сярод нашых ананімных аўтараў дзеці й падлеткі не заўважаныя. Але В.Быкаў, напрыклад, згадваў, што на судзе супраць дырэктара школы сьведчыла 15-гадовая вучаніца. Жанчыны ж сярод сексотаў, несумненна, былі: «Доська», «Сафо», «Блуза».

Былі вельмі распаўсюджаныя мянушкі іншаземнага паходжаньня: «Хіл», «Пат», «Бэрлін», «Шак», «Гер» ды інш. Мянушкамі станавіліся як беспрадметныя паняткі, так і назвы прадметаў з розных сфэраў жыцьця: «Сураж» і «Камета», «Вясёлы» і «Бомба», «Арка» і «Шуба», «Гудок» і «Газ», «Радыё» і «Шыла»… Некаторыя падпісваліся прозьвішчамі ды імёнамі (вядома ж, ня ўласнымі): «Хамутоў», «Гракаў», «Шустаў», «Коля», «Саша», «Фелікс» і г.д. Ну й нарэшце, закладваў багацеяў «Бядняк», пільна сачыў за суседзямі «Зоркі», пастаянна над галовамі ворагаў савецкай улады былі занесеныя «Тапор» і «Меч». Зусім, відаць, невыпадкова амаль штодня страчыў даносы «Выпадковы». Не аднаму жыхару Воршы зрабіў кіслым жыцьцё «Лімон». Шчыравалі на «паляваньні» «Сокал» і «Ястраб». І не дрыжэла ў «Нашага» «Барышніка» «Рука», пішучы «Пяром» данос у «Бараку» за «Шкафам». Нарэшце, зьеўшы не адзін «Пуд» «Солі» на сваёй працы, кожны стукач лічыў сябе калі не «Каралём», дык «Героем».

Сетка сексотаў ахоплівала як Воршу, так і наваколье. У данясеньнях згадваюцца Копысь, Міцькаўшчына, Машкова. Некаторыя сексоты паведамлялі пра падзеі і «падазроных» асобаў як у горадзе, так і ў сельскай мясцовасьці. Сярод іх, напрыклад, «Выпадковы», які, магчыма, быў нейкім агентам (ня толькі тайным), бо ягоныя даносы тычацца жыхароў розных раёнаў Воршы, а таксама шмат якіх мястэчак і вёсак. Ён пісаў, між іншага, пра будаўніцтва хлебазаводу й кінатэатру і паўсюль выкрываў раскрадальнікаў сацыялістычнай маёмасьці, афэрыстаў ды лайдакоў. Пра гэтага «асьведаміцеля» хочацца апавесьці крыху болей. Так, відаць, па заданьні органаў ён у верасьні—кастрычніку 1933 г. уладкаваўся вартаўніком на параходную прыстань Воршы. У адным з даносаў піша: «За час майго прэбываньня вартаўніком пакраж якіх бы не было матэрыялаў ня мела месца» пра тое, што ягоная таемная праца не заўсёды была небясьпечнай сьведчыць адно з данясеньняў «Выпадковага»: «У вёсцы Пронцаўка Ц-ў К.М. трымае ў сябе бандытаў, а іменна сам я ўчора лічна ў 10 гадзін днём бачыў, як зайшоў да яго невядомы гр-н, і калі я ў яго запытаў, адкуль ты, ён мне адказаў, а якое табе дзела, тады я сказаў стой, а ён выніў адрэз з-пад палы і наставіў мне ў грудзі, я пачаў крычаць, на мой крык зьбяжаліся калгасьнікі з калгасу «13 з'езд КП(б)Б» з Засьценка Якаўлевіцкага с/с… невядомы бандзіт стаў уцякаць і ўцёк у лес, паміма адрэза ў яго быў рэвальвер». (Артаграфія арыгіналу захаваная; у адпаведнасьці зь дзейным заканадаўствам тайна асабістага жыцьця мае 75-гадовы тэрмін, таму

**Віктар Лютынскі**

Гісторык, жыве ў Воршы.

# «І згаджаліся мільёны стаць стукачамі»

большасьць асобаў, пазначаных у даносах, мы абмяжуем ініцыяламі — **В.Л.**).

Дарэчы, гэтага сексота можна «вылічыць», бо ў адным з данясеньняў ён піша: «Прозьвішча маё прашу не выдаваць, пражываю па Замкавай вуліцы, д.22». Праўда, дома з такім нумарам на сёньняшняй вуліцы Замкавай няма, і, наагул, пасьля вайны яна зьнікла з карты гораду і адноўлена толькі ў пачатку 1990-х. Але ж у адной з архіўных справаў захаваўся пералік вуліцаў з пазначэньнем гаспадароў дамоў. Няма нічога тайнага, што не зрабілася б яўным…



## «Неблаганадзейныя элемэнты»

У той час афіцыйнай мовай справаводзтва нават у ГПУ была «тарашкевіца». Праўда, збольшага мова тая — звычайная «трасянка», што сьведчыць пра нізкі адукацыйны ўзровень як стукачоў, так і ГПУ.

Пачнем з важнейшых тэмаў з пункту гледжаньня арганізатараў сеткі тайных інфарматараў. Дзіўна, але зьвесткі пра антысавецкія і антыкамуністычныя настроі насельніцтва Аршаншчыны сустракаюцца рэдка. Так, нейкі «Коля» даносіў на качагара мясакамбінату Парфена А., які «выступае супраць савецкай улады, гавора, што перарэзаў бы ўсіх жыдоў і рука б ня дрогнула, дабаўляе, што савецкая ўлада толькі ўмее красіва гаварыць, а на справе ўсіх абманвае». На Макара С., які ўдзельнічаў у габрэйскім пагроме ў Воршы ў 1905 г., паведамляў у ГПУ «Выпадковы». Гэтым, бадай, і абмяжоўваюцца паведамленьні сексотаў пра «неблаганадзейныя элемэнты». І гэта пры тым, што амаль усіх, каго прыцягвалі па даносах да адказнасьці, абвінавачвалі ў контрарэвалюцыйнай дзейнасьці.

Адной з асноўных тэмаў даносаў была інфармацыя пра безгаспадарчасьць, якая панавала тады і ў прамысловасьці (нават на знакамітых будоўлях першай пяцігодкі!), і ў сельскай гаспадарцы (у ёй асабліва, хоць калектывізацыя яшчэ не была завершаная). Сярод паведамленьняў пра кепскіх дырэктараў, старшыняў калгасаў і брыгадзіраў паведамленьні пра масавае раскраданьне сацыялістычнай уласнасьці, дрэннае харчаваньне на заводах, сустракаюцца й даносы пра «нясвоечасовую выплату зарплаты». Безгаспадарчасьць была заўважана агентамі на ільнокамбінаце, БелДРЭСе, заводзе «Чырвоны Кастрычнік» (у апублікаваных афіцыйных гісторыях гэтых трох буйных прадпрыемстваў Аршаншчыны пра гэта няма ні радка) ды драбнейшых прадпрыемствах.

Некаторыя сексоты былі людзьмі вельмі скрупулёзнымі. «Кім» падрабязна інфармаваў органы, колькі кілаграмаў паліва адпускае розным спэкулянтам загадчык Аршанскай нафтабазы Б. Гэты ж данос «Выпадковага» хочацца прывесьці цалкам: «У Б.Марыі, якая жыве на Воршы-Заходнай., барак №15, кв. 2 хаваецца ў сундуку торба сахару, якая ўкрадзеная з пакгаўза і вотрубі ў сараі ў цэбры і ў кватэры ў мяху, яна казала, калі яна нясла то дужа баялася, але каб яе затрымалі, то яна ўсіх бы выдала. У сараі пад палом ляжаць дзьве юбкі сшытыя…». Нагадаю, што ў жніўні 1932 г. выйшла сумнавядомая Пастанова ЦВК і СНК СССР «Аб ахове маёмасьці дзяржаўных прадпрыемстваў, калгасаў і каапэрацыі і ўмацаваньні грамадзкай (сацыялістычнай) уласнасьці». Згодна зь ёй, людзі, якія спакушаліся на грамадзкую маёмасьць, абвяшчаліся «ворагамі народу», і да іх прымяняліся самыя суровыя пакараньні, аж да сьмяротнага.

## «Радзімыя плямы капіталізму»

Уяўленьне пра тое, што ў гады савецкай улады панавалі ледзь ня пурытанскія норавы, яскрава абвяргаецца данясеньнямі сексотаў. Злачыннасьць, п’янства, прастытуцыя — усё гэта цьвіло пышным цьветам і ў першай у сьвеце краіне пераможнага сацыялізму. Так, «Выпадковы» паведамляў пра грамадзянку Я., якая жыла на станцыі Ворша і займалася прастытуцыяй: «У ёй кожны вечар бывае чалавек па 5 хлопцаў».

Дарэчы, на кожны данос апэратыўным работнікам ГПУ рабілася заключэньне і вызначаліся адпаведныя мерапрыемствы. У дадзеным выпадку запісана: «Памясьціць у агентурную распрацоўку. Весьці далейшы нагляд за домам Я.».

«Гр-ка М. Хадоса, жыхарствуючая на Аршанскім ільнокамбінаце, працуе кубаўшчыцай, гандлюе гарэлкай,— інфармаваў сексот «Боб».— Трымае прытон прастытуцыі, да яе ходзяць як вольныя, а таксама кожны вечар бываюць чырвонаармейцы 192 стралковага палка». «Выпадковы» даносіў: «Бухгалтар Аршанскага вучылішча О. 6 лістапада п’янстваваў сумесна з прыехаўшай з Салаўкоў прасьцітуткай К…

на базары ў піўной расьпівалі гарэлку і піва, нада палагаць, што О. п'е на казённыя грошы». «Выпадковага» быццам цягнула ў тыя прытоны: «Жыхарствуючая ў г.Воршы па вул. Энгельса ў д.№42 гр-ка К. трымае прытон у сябе ў кватэры і падазрыцельных асоб, як, напрыклад, у яе кватэры 5/XII-32 г. напіўся пом. ком. взвода Аэрапарку П.Георгій і іншыя, посьле чаго вышлі на ўліцу, пачалі хуліганіць». Гэпэушнік заўважыў на палях: «Праверана, патвердзілась. К. взят на ўчот». Відаць, «Выпадковы» быў чалавекам вельмі дзейным, у чым мы ўжо перакаваліся, бо «стучаў» рэгулярна й часта, і лёгка ўціраўся ў давер, хутчэй за ўсё й выпіваў з тым, на каго потым даносіў. Прыгадваюцца радкі «Сказу пра Лысую гару»:

Калі ў кампаніі парою
Не зразумець было, хоць плач,
Хто лезе чокацца з табою:
Ці шчыры сябра, ці стукач.

Злачынствам было й захоўваньне агнястрэльнай зброі. Пра гэта таксама шмат данясеньняў. Нястомны «Выпадковы» даносіў на каапэратара Цімафея Салтановіча (будучага Героя сацыялістычнай працы, вядомага калгаснага кіраўніка), які «жыве ў в.Машкова і мае рэвальвэр «Наган». Але ня мае на гэта дазволу. Гэты «наган» я сам бачыў». Ці была знойдзена органамі зброя, невядома, хутчэй за ўсё не, бо ў 1933 г. Ц.Салтановіч стаў старшынём калгасу «Бальшавік». А вось данос таго ж «Выпадковага» на А.Купаву, які жыў па вул.Першамайскай у Воршы і «меў рэвальвер» не пацьвердзіўся — пры вобыску ён ня быў знойдзены. Што было, калі данос аказваўся ілжывым? Ня ведаю. Можа, агентаў пазбаўлялі прэміяльных?

## «Залаты паток»

Адна з главаў «Архіпэлягу ГУЛАГу» трапна названая «Людзі гінуць за мэтал». «З канца 1929 г., — піша А.Салжаніцын,—пачынаецца знакамітая залатая ліхаманка, толькі ліхаманіць ня тых, хто золата шукае, а тых, з каго яго трасуць… Ужо нічым — не пралетарскай сутнасьцю, ні рэвалюцыйнымі заслугамі ня можа абараніцца той, на каго паў цень залатога даносу».

Адкуль у простых савецкіх абывацеляў залатыя грошы ды валюта? Па-першае, з моманту рэвалюцыі і экспрапрыяцыі прайшло ня так шмат часу і палітычныя рэпрэсіі не зачапілі яшчэ ўсіх былых эксплюататараў. Па-другое, такія-сякія грошы засталіся ў былых нэпманаў. Па-трэцяе, у некаторых аршанцаў меліся родзічы за мяжой (пераважна ў ЗША, куды эмігравалі дзясяткі месьцічаў), якія дасылалі сюды даляры. Іх з канвэртаў тады не вымалі.

Вось «Коля» і даносіў на грамадзяніна Ш., які жыў па 1-м зав.Урыцкага: «У час рэвалюцыі меў цесную сувязь з таможнікамі, ад якіх назьбіраў шмат залатых грошай. Зараз з маёмасьці мае — уласны дом, агарод і навогул добра жыве». Гэты сексот (ці не «спэцыялізаваўся» на «залатой жыле»?) паведамляў пра грамадзянку Э., якая жыла па 2-й Пустынкаўскай вуліцы: «Яе муж працуе ламавым фурманам, а яна раней займалася прастытуцыяй. З маёмасьці мае дом, і ў гэтым доме трымала таможню, у той час у яе быў ухажор таможнік, звалі якога «Шурка», які расстраляны ў 1918 г. за якое-та злачынства. Гэты «Шурка» пакінуў шмат золата Э., якая і цяпер мае». «Выпадковы» зрабіў данос на аршанца К.: «Мае суродзічаў у Амэрыцы, якія дасылаюць яму долеры, долераў ён мае каля 300 рублёў».

Наколькі ўзбагацілася краіна, канфіскаваўшы ў аршанцаў золата й валюту, ня ведаю. Але «ўнёсак» гэты ў сацыялістычнае будаўніцтва быў не малы.

## Выбранае

На згаданыя тэмы даносы налічваюцца дзясяткамі. Цяпер жа хочацца прывесьці некалькі даносаў, якія яскрава характарызуюць той надзвычай супярэчлівы й драматычны час. Так, «Выпадковы» даносіў на дэпутатку Аршанскага гарсавету Паўліну І., якая выдавала хлусьлівыя дакумэнты (пацьвердзіць ці абвергнуць сьцьвярджэньні спэцагентаў мы, на жаль, ня маем магчымасьці). Зноў жа «Выпадковы» інфармаваў органы пра касіра ТПО, які «мае аўтобусныя білеты, па якіх сам ездзіць, а таксама надзеляіць служачых ТПО, вазьнікае пытаньне: адкуль бярэ?» Супрацоўнік ГПУ дадаў: «завесьці агентурную распрацоўку». Або даносілі на нейкага С., які атрымліваў хлебныя карткі на мёртвыя душы. Як бачым, сюжэты вечныя.

Той самы «Выпадковы» паведамляў: «23.XI-32 г. у інтэрнат коннага запасу міліцыі прыйшоў надзірацель Аршанскага іспраўдома Дубкоў, які расказаў аб тым, як зь іспраўдома бралі на растрэл, і вялі ў канцылярыю, гавора што прышло памілаваньне, а потым, што выводзяць: дзе стаіць машына і наогул увесь метад як забіраюць на растрэл, гэта расказаў Дубкоў у прысутнасьці міліцыянэраў коннага запасу». Якое пакараньне за разгалошваньне дзяржаўных сакрэтаў панёс Дубкоў, невядома. А вось завэрбаваныя агенты ГПУ падпісвалі «Абавязацельства», у якім абавязваліся «захоўваць у найстражайшым сакрэце ўсе зьвесткі і даныя аб рабоце ОГПУ і яго органаў, ні пад якім выглядам іх не разгалошваць і не дзяліцца імі нават са сваімі бліжэйшымі родзічамі і сябрамі».

## Ахвяры не захаваліся ў «Памяці»

Прагледзеўшы сьпісы ахвяраў палітычных рэпрэсіяў, зьмешчаныя ў кнізе «Памяць. Орша і Аршанскі раён», не знайшоў ніводнага зь пералічаных «герояў» даносаў. Не маглі ж іх усіх запісаць у крымінальнікі? Як вядома, найбольш масавыя рэпрэсіі былі разгорнутыя сталінскім рэжымам у 1937-1938 г. Але і ў тыя жудасныя гады ніхто зь пералічаных «ворагаў народу» (шкоднікаў, раскрадальнікаў сацыялістычнай маёмасьці, прастытутак, падпольных багацеяў), калі верыць сьпісам рэпрэсаваных з кнігі «Памяць», не пацярпеў. Праўда, сьпісы тыя далёка ня поўныя. Тыя ж, хто быў асуджаны ў 1932—1933 гг., атрымалі адносна невялікія тэрміны: да 3 гадоў зьняволеньня ды высылку ў розныя аддаленыя раёны СССР.

Дарэчы, ананімнасьць сексотаў (прынамсі, асобных) была ўяўнай. Так, аршанскі старажыл Рыгор Цыпкін успамінае, што «некаторых даносчыкаў народ ведаў добра і імкнуўся не размаўляць зь імі, людзі пераходзілі вуліцу, каб не сутыкнуцца тварам у твар, а раптам нешта таму не спадабаецца».

Нам невядома, як скончыўся жыцьцёвы і стукацкі шлях таго ж «Выпадковага». Але пакуль у нас не асуджаныя і не пакараныя (нават маральна), каты ГУЛАГу, якія дажываюць век, на сумленьні якіх сотні тысячаў бязьвінных ахвяраў, сексоты могуць спаць спакойна. Пытаньне пра люстрацыі ў нашым грамадзтве ніколі нават і не падымалася. Раскрыцьцё імёнаў шматлікіх тайных агентаў спэцслужбы камуністычнага рэжыму было б «бомбай» страшэннай разбуральнай сілы. Але гэты працэс меў бы і вялікае ачышчальнае значэньне, стаў бы гарантыяй таго, што падобнага больш ня будзе ніколі.




Аднойчы Капітан Танака і яго сябар Гузік прачыталі ў кнізе пра тое, што можна адшукаць скарб, які схаваны ў доме з прывідамі.












http://www.tanakaland.org

Працяг будзе...




## ВЫСТАВЫ

### Скарбы старадаўняга мастацтва

**У Нацыянальным мастацкім музэі (вул.Леніна, 20)** працуе выстава «Абразы, кнігі, мастацкае ліцьцё XII—XX стст. (з фондаў Мастацкага музэю і Веткаўскага музэю народнай творчасьці). Унікальныя кнігі і абразы са збору ў Ветцы.


PHOTO.BYMEDIA.NET

### Лошыца

**У галерэі NOVA (вул.Харужай, 16) да 12 кастрычніка** працуе фотавыстава-рэмэйк «Лошыца».

### Неакрэсьлены стан

**У музэі Максіма Багдановіча (вул.Багдановіча, 7а)** працуе выстава графічных твораў Андрэя Скіцёва «Неакрэсьлены стан».

### Беларуская Барбі

Выстава найлепшых работ дзіцячага конкурсу «Беларусачка прыгажэй за Барбі» працуе **да канца верасьня ў Цэнтры мастацкай творчасьці дзяцей і моладзі (Кірава, 16)**. Найлепшыя дзіцячыя творы застануцца ў экспазыцыі «Беларуская нацыянальная лялька».

### Выстава Паўла Татарнікава

**Да 9 верасьня ў мастацкай галерэі «Ўнівэрсытэт культуры» (Кастрычніцкая пл., 1)** праходзіць выстава ілюстрацый мастака Паўла Татарнікава «Казка пра п'есу і опэру». П.Татарнікаў праілюстраваў каля 50 кніг. Яго творы знаходзяцца ў зборах музэяў Менску, Берасьця, Браціславы, Мюнстэру.

На выставе дэманструюцца ілюстрацыі да п'есы Ў.Шэкспіра «Вэнэцыянскі купец», да лібрэта опэры Р.Вагнэра «Золата Рэйну» і казкі Г.Х.Андэрсэна «Сьнежная каралева». **Вернісаж адбудзецца 7 верасьня а 16-й.**

## ТЭАТРЫ

### Купалаўскі тэатар

**7 (пт)** — «Таполевая завея».
**8 (сб)** — «Я не пакіну цябе...».
**9 (ндз)** — «Смак яблыка».
**10 (пн)** — «Вечар».
**12 (ср)** — «Чычыкаў».
**13 (чц)** — «Чорная панна Нясьвіжу».
**15 (сб)** — «Ромул Вялікі».
**16 (ндз)** — «Кім».

*ранішнія спэктаклі*

**16 (ндз)** — «Сьнежная каралева».

*малая сцэна*

**10 (пн)** — «Дзікае паляваньне караля Стаха».
**14 (пт)** — «Балада пра каханьне».

## КАНЦЭРТ

### Трып-хоп па-беларуску

9 верасьня, у кавярні «Стары Менск» — акустычны трып-хоп па-беларуску. Гурт «Urban Life» грае сьветлую энэргетычную музыку. Пачатак а 19-й.

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Француская для пачаткоўцаў

Рамантычная падлеткавая камэдыя зь Нямеччыны.

**Француская для пачаткоўцаў**
(Französisch für Anfänger)

Нямеччына, 2006, каляровы, 98 хв.

**Рэжысэр:** Крыстыян Дытэр

**Ролі выконваюць:** Франсуа Геск, Паула Шрам, Ленард Берцбах, Эладзі Бале, Тадэвуш Майлінгер, Дзітрых Адам

**Жанр:** Рамантычная падлеткавая камэдыя

**Адзнака:** 5 (з 10)

Нямецкі школьнік Генрых двух словаў ня можа зьвязаць па-француску. Але, каб спадабацца дзяўчыне Валеры, ён разам з школьным гуртком франкафілаў адпраўляецца ў Парыж…

Першае каханьне, неразуменьне — і нямота ў чужым горадзе. Позіркі, стук сэрца — і прызнаньне пры канцы.

У адрозьненьні ад падлеткавых амэрыканскіх камэдый з рыгальнымі жартамі і прышчавым сэксам — нямецкая карціна Дытэра цнатлівая, як дзіцячы пацалунак. Гэта не замінае героям раўнаваць, засмучацца, баяцца сказаць слова, саромецца, зьдзіўляцца й радавацца.

Нямецкае кіно заўжды вылучалася сацыяльным позіркам — і камэдыі тут ня вынятак. Кантраст культураў выклікае сьмешныя непаразуменьні; герой вучыцца чужой культуры, дый увазе да іншага чалавека.

Гумар у карціне карэктна-сацыяльны, героі — ціхмяныя й амаль бесканфліктныя (што не замінае падлеткавым жарсьцям).

Фільм — амаль дыетычнае відовішча для падлеткаў. Ён можа быць сьмела рэкамэндаваны для школьных праглядаў. Па кантрасьце зь пераважнай большасьцю кінапрадукцыі выклікае зьдзіўленьне.

**Андрэй Расінскі**




# ГІСТОРЫЯ Ў «НН»

*Верасень 2007*

**Героі вяртаюцца ў гісторыю.**
Гутарка з Уладзімерам Арловым ........ 18

**Жыцьцё і сьмерць Паўла Марозава.**
Піша Вацлаў Шаблінскі ........ 22

**Бацькава выхаваньне.**
Пра Міхася Раманюка зь яго сынам Дзянісам гутарыць Зьміцер Панкавец ........ 24

**«І згаджаліся мільёны стаць стукачамі».**
Гісторыка-дакумэнтальны нарыс Віктара Лютынскага ........ 27

## КУР'ЁЗ




ЯРАСЛАЎ СЬЦЕШЫК

**Во якія фільмы ў Дзень беларускай вайсковай славы паказваюць менскія кінатэатры (афіша была заўважаная на «Перамозе»). Няўжо гэта — пра Аршанскую бітву? Але чаму тады на мове тагачаснага праціўніка? Ці гэта іх вэрсія падзей 1514 году?**

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Яўгену С. зь Пінску.** Тое, што матэрыял друкуецца на паласе «Пошта рэдакцыі», не прыніжае яго вартасьці. Проста ён найбольш да гэтай паласы пасуе. Бо ўсё ў газэце мусіць быць на сваіх месцах. Якуб Колас і Зьмітрок Бядуля не стыдаліся друкавацца у адпаведных «Пошце» рубрыках «НН» пачатку стагодзьдзя.

**Андрэю В.** з Смургоняў. Вершы не для друку.

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

У Коўне адбыўся зьезд літоўскіх кабет. Сабралася іх каля 300 — найбольш вясковых. Гаварылі аб тым, што кабеты могуць шмат памагчы ў працы над асьветай народа; казалі і аб палажэньні і долі кабет у вёсках, аб патрэбе іхняга саюза і аб тым, каб дабівацца ад Думы для кабет роўных правоў з мужчынамі. Вось якія кабеты ў Літве. Пара бы і нашым кабетам пазнаць, што і яны — людзі такія самыя, як мужыкі іх.

**«Наша Ніва». №31. 1907**




# А ты падпішыся!

Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву», проста падпішыце дамову. Дэталі — **старонка 17.**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### КНІГІ

**Новая кніга** з сэрыі «Беларускі кнігазбор», «Старажытная беларуская літаратура», а таксама апошнія асобнікі «Беларускіх летапісаў» і розныя іншыя беларускія выданьні на кніжным кірмашы па вул. Янкі Купалы, 27

**Шукаю**: Біблію ў перакладзе д-ра Я. Станкевіча, слоўнік д-ра Я.Станкевіча, Новы Запавет (ці цалкам Біблію) у перакладзе У.Чарняўскага, выдадзеныя ў Празе лацінай. Т.: 029-525-17-35. Юрась

**Абмен культуралягічнай інфармацыяй**, кнігамі. Дашлю сьпіс прапаноў. Канфэрэнцыі, літаратурныя вечарыны, выдавецкія праекты. Ад Вас — капэрта са зваротным адрасам. А/с 195, 220030, Менск. alesknigi@mail.ru

### ПРАЦА

**Якасна выканаю** пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры, мове. Зьвяртацца загадзя. Т.: 101-03-24. Юрась.

### ДАВЕДНІК

**Падрыхтаваны** энцыкляпэдычны даведнік «Рэпрэсаваныя мэдыкі». Калі вам вядома што пра пакутнікаў або ёсьць магчымасьць паўдзельнічаць у праекце, тэлефануйце: 753-82-12, 755-25-61, (017) 211-09-53. Леанід Маракоў

**Наша Ніва**
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша ніва»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102-71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2239. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 05.09.2007.
Замова № 4865.
Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102-71.